ПАРЫЖ, 18. Парыская паліцыя, у колькасьці звыш ста агентаў, уварвалася ў рэдакцыю «Юманітэ» і заняла ўсё памяшканьне. Паліцэйскія агенты зрабілі вобыск, забраўшы пры гэтым усе паперы, якія пападаліся ім пад руку. Адначасова зроблен налёт на дом кампартыі і рабочы каапаратыў. Арыштавана 8 асоб, у тым ліку рэдактар «Юманітэ»—стары камунар Ноэль. Паліцэйскія налёты зроблены ў сувязі з арганізацыяй дню 1-га жніўня.

ЗЬВЯЗДА

№ 162 (3270) Пятніца, 19-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781

Вылучэньне членаў ЦВК БССР—рабочых і сялян. Прэзыдыум ЦВК дадаткова вызначыў рад адказных пасад у цэнтральных установах БССР, якія павінны быць замешчаны ў абавязковым парадку членамі ЦВК БССР—рабочымі і сялянамі. Разам з тым Прэзыдыум ЦВК БССР прызнаў патрэбным пашырыць колькасьць адказных пасад, што павінны быць замешчаны вылучэнцамі—членамі ЦВК БССР.

Разрыў савецка-кітайскіх дыплёматычных адносін

НАГЛЫ АДКАЗ КІТАЙСКАГА ЎРАДУ НА САВЕЦКУЮ НОТУ АД 13 ЛІПЕНЯ

АДКАЗ КІТАЙСКАГА ЎРАДУ

Нота паверанага па справах Кітайскай рэспублікі пана Ся Вэй-суна на імя намесьніка Наркома замежных спраў т. Л. М. Карахана

Масква, 17 ліпеня 1929 году.

ПАНЕ НАРОДНЫ КАМІСАР!

Маю гонар давесьці да вашага ведама наступную тэлеграму міністэрства замежных спраў кітайскай рэспублікі, яную я атрымаў сёньня, 17-га ліпеня:

«Расшыфроўка вашае тэлеграмы ад 14 ліпеня закончана толькі сёньня. Загадваем вам перакласьці на расійскую мову і перадаць народнаму камісарыяту замежных спраў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у пісьмовай форме наступны адказ на яго ноту ад 13 ліпеня:

«З таго часу, як у 1924 годзе заключана была кітайска-савецкая згода, дыплёматычныя адносіны паміж дзьвюма дзяржавамі сапраўды ўзмацніліся. На падставе звычайнага прыяцельства, адносіны кітайскага ўраду і яго народу да савецкага ўраду і яго народу заўсёды прасякнуты былі духам роўнасьці і шчырае дапамогі. Але за апошні час у межах Кітаю ня раз былі выкрыты як арганізаваная прапаганда, так і яе работа накіраваная да таго, каб падштурхнуць кітайскі народ да разбурэньня кітайскага грамадзкага ладу, і да таго, каб народ быў супроць кітайскага ўраду. Апошні, прымушаны гэтым, ня мог ня прыняць належных мер да падтрыманьня грамадзкага парадку кітайскае дзяржавы. На гэты раз вобыск у памяшканьні савецкага консульства ў Харбіне і меры ў адносінах Кітайска-Усходняй чыгункі зроблены былі ўладамі трох усходніх правінцый са спэцыяльнай мэтай — адхіліць парушэньні спакою і парадку, якія могуць раптоўна выбухнуць, прычым, улады прымушаны былі ўжыць неабходныя меры экстрэна і праявілі найвышэйшую асьцярожнасьць, каб сфэра дзейнічаньня не захапіла большае адлегласьці. Урад кітайскае рэспублікі неаднакраць атрымліваў даклады ад мясцовых улад трох усходніх правінцый аб тым, што кіраўнік Кіт.-Усх. чыгункаю і важныя супрацоўнікі гэтай чыгункі з савецкіх грамадзян ня выконвалі і ня выконваюць дакладна часовае згоды 1924 году аб Кіт.-Усх. чыгунцы з самага пачатку і да гэтага часу. На працягу апошніх год кіраўнік чыгункі і іншыя зрабілі такую масу супрацьзаконных учынкаў, якія выходзяць па-за межы іх улады, што няма магчымасьці іх усе пералічыць. Такім чынам і кітайскія супрацоўнікі К.-Усх. чыгункі, якія хочуць выконваць згоду і выконваць паводле яе свае абавязкі, пазбаўлены магчымасьці ажыцьцяўляць згоду, а тым больш савецкія супрацоўнікі, якія карыстаюцца савецкімі установамі ў данай мясцовасьці, вядуць патаемна прапаганду, парушаючы гэтым кітайска-савецкую згоду. З гэтай прычыны мясцовыя ўлады трох усходніх правінцый не маглі ня прыняць у адносінах К-Усх. чыгункі даных мер.

Ясна і зразумела, што адказнасьць за парушэньне кітайска-савецкае згоды не ляжыць на нашым баку. Паводле вестак, якія атрымала міністэрства замежных спраў ад свайго пасольства і консульства ў СССР, ДПУ Савецкага Саюзу бяз усякіх прычын арыштавала і трымае пад арыштам ня менш тысячы нашых эмігрантаў і гандляроў. Нашы грамадзяне, што прыяжджаюць з СССР, прыгнечаны чыннасьцю савецкага боку, а яшчэ большая колькасьць пазбаўлена магчымасьці пражываньня. Адначасова, савецкія эмігранты і гандляры, што пражываюць у Кітаі, а таксама савецкія камэрцыйныя ўстановы, што тут знаходзяцца, карыстаюцца з боку ўраду кітайскае рэспублікі гасьціннасьцю, шчырасьцю і ўсім ім прадастаўлены вялікія выгады. У адносінах якіх-небудзь савецкіх грамадзян у Кітаі ня чынілася ніякіх пэрашкод, ніколі ня ўжывалася аднабаковае несправядлівасьці. І калі на гэты раз улады трох усходніх правінцый арыштавалі савецкіх грамадзян і апячаталі савецкія ўстановы, дык выключна з мэтаю зьнішчыць супроцьдзейную прапаганду і падтрымаць неабходны грамадзкі парадак і супакой.

Урад кітайскае рэспублікі, хоць і ня лічыць ніжэй паданыя пункты за ўмову, але калі савецкі ўрад, папершае, вызваліць усіх арыштаваных ДПУ кітайскіх грамадзян і прадаставіць ім магчымасьць вярнуцца на бацькаўшчыну, ня ўключаючы сюды тых, якія вызвалены пры паруках пасольства і консульства з дазволам пражываць у межах СССР, і, падругое, калі ўсім грамадзянам, гандлярам і таварыствам будзе гарантавана пэўная і патрэбная абарона, дык у адпаведны момант будуць ужыты адпаведныя адносіны да ўсіх апячатаных савецкіх установаў.

Адным словам, урад кітайскай рэспублікі і яго народ адносяцца да савецкага ўраду і яго народу з надзеяй, што савецкі ўрад самасьвядома выправіць свае няправільныя ўчынкі, зробленыя ў мінулым, а ў адносінах данае справы трэба, каб савецкі ўрад з павагаю адносіўся да сувэрэнітэту Кітаю і яго законаў і не рабіў прапаноў, якія адмаўляюць існуючыя факты. Урад кітайскай рэспублікі мае намер аддаць загад свайму пасланьніку пану Чжу Нау-ян па дарозе да месца сваёй службы спыніцца ў Харбіне і ўсё расьсьледваць. Усе справы, якія датычаць узаемаадносін СССР і Кітаю і адносін да К.-Усх. чыгункі маглі-б своячасова і супольна з народным камісарыятам замежных спраў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік вырашаны па справядлівасьці і закону.

Міністэрства замежных спраў кітайскае рэспублікі,
горад Нанкін, 16-га ліпеня.

Прымеце, пане народны камісар, запэўненьні ў маёй да вас пашане.
СЯ ВЭЙ-СУН (подпіс)».

НОТА САВЕЦКАГА ЎРАДУ

Нота намесьніка наркома замежных спраў т. Л. М. Карвхана на імя паверанага па справах Кітайскай рэспублікі пана Ся Вэй-суна

Масква, 17 ліпеня, 1929 году.

«Пане паверaны ў справах!

Пацьвярджаючы атрыманьне вашай ноты ад 17-га ліпеня г. г., якая зьмяшчае ў сабе адказ кітайскага ўраду ў Нанкіне на ноту Саюзнага ўраду ад 13-га ліпеня г. г., маю гонар паведаміць вам ад імя ўраду СССР наступнае:

Саюзны ўрад лічыць адказ кітайскага ўраду нездавальняючым па зьместу і крывадушным па тону. Жадаючы аднавіць прававую базу ва ўзаемаадносінах паміж СССР і Кітаем, парушаную кітайскімі ўладамі, саюзны ўрад высунуў у сваёй ноце ад 13-га ліпеня тры мінімальна патрэбных і зусім умераныя прапановы: 1) спыненьне аднабаковых і зусім незаконных учынкаў кітайскіх улад на К.-Усх. чыгунцы, якія парушаюць існуючую згоду паміж СССР і Кітаем; 2) спыненьне рэпрэсій супроць савецкіх грамадзян і савецкіх устаноў; 3) скліканьне канфэрэнцыі бакоў для ўрэгуляваньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з К.-Усх. чыгункай.

Кітайскі ўрад у адказ на прапанову ўраду СССР па сутнасьці справы адхіліў гэтыя прапановы. Замест аднаўленьня пекінскае і мукдэнскае згод аднабакова скасаваных кітайскімі ўладамі і захаваньня, такім чынам, базы для добрасуседзкіх адносін, нота кітайскага ўраду санкцыянуе аднабаковае скасаваньне гэтае згоды і тым самым зьнішчае магчымасьць нармальных адносін паміж абедзьвюма дзяржавамі. Замест скасаваньня незаконных учынкаў дубаня К.-Усх. чыгункі, які гвалтоўна зьняў з пасады афіцыйных асоб, назначаных праўленьнем па прадстаўленьні СССР, нота кітайскага ўраду санкцыянуе гэтыя незаконныя ўчынкі, апраўдваючы тым самым захопніцтва К.-Усх. чыг. Замест спыненьня незаконных рэпрэсій супроць савецкіх грамадзян і савецкіх устаноў, нота кітайскага ўраду санкцыянуе гэтыя рэпрэсіі і крывадушна прабуе апраўдаць іх фальшывай спасылкай на нібы масавыя рэпрэсіі ў адносінах кітайскіх грамадзян у СССР, добра ведаючы, што рэпрэсіі ўжываюцца ў СССР толькі ў адносінах нікчэмнае групы шпіёнаў, гандляроў опіем, утрымальнікаў дамоў распусты, кантрабандыстых і іншых крымінальных элемэнтаў з кітайскіх грамадзян. Замест простае згоды на неадкладнае скліканьне канфэрэнцыі бакоў для ўрэгуляваньня ўсіх канфліктных пытаньняў, нота кітайскага ўраду абыходзіць гэта пытаньне, адхіляючы тым самым прапанову ўраду СССР аб канфэрэнцыі і зьнішчаючы, такім чынам, магчымасьць урэгуляваньня канфлікту шляхам згоды бакоў. Спасыланьне ноты кітайскага ўраду на прапаганду, як на прычыну незаконных учынкаў кітайскіх улад, ілжывае і крывадушнае, бо кітайскія ўлады маюць на сваёй тэрыторыі досыць сродкаў, каб не дапушчаць і спыняць такую дзейнасьць, калі-б яна сапраўды мела месца, без таго, каб захапіць К.-У. чыгункі і парываць існуючыя паміж Кітаем і СССР дагаворныя зносіны.

Сапраўдная падаплёка гвалтоўнае чыннасьці кітайскіх улад на КУЧ і ноты кітайскага ўраду ад 17 ліпеня, якая санкцыянуе гэтыя гвалты, становіцца асабліва выразнай з афіцыйнае дэклярацыі кіраўніка кітайскае дзяржавы пана Чан Кай-шы, агалошанай у друку. У гэтай дэклярацыі Чан Кай-шы, зазначаючы аб незаконных учынках кітайскіх улад на КУЧ і апраўдваючы гэтым іх чыннасьць, проста заяўляе: «Нашы крокі, накіраваныя да таго, каб узяць КУЧ у свае рукі, ня маюць у сабе нічога нязвычайнага... Мы хочам спачатку ўзяць у свае рукі КУЧ, а потым прыступіць да абгаварэньня іншых пытаньняў». Гэтыя заявы пана Чан Кай-шы пацьвярджаюць сапраўдную падаплёку ноты кітайскага ўраду ад 17-га ліпеня.

Саюзны ўрад канстатуе з гэтай прычыны, што ўжо вычэрпаны ўсе сродкі, патрэбныя для ўрэгуляваньня шляхам згоды спрэчных пытаньняў і канфліктаў на КУЧ, выкліканых кітайскімі ўладамі і ўгрунтаваных нотаю кітайскага ўраду ад 17 ліпеня. На падставе вышэйпаданага, Саюзны ўрад прымушан ужыць наступныя меры, ускладаючы ўсю адказнасьць за вынікі на кітайскі ўрад: 1) Адклікаць усіх савецкіх дыплёматычных консульскіх і гандлёвых прадстаўнікоў з тэрыторыі Кітаю; 2) Адклікаць усіх асоб, назначаных саюзным урадам на КУЧ, з тэрыторыі Кітаю; 3) Спыніць усякую чыгуначную сувязь паміж Кітаем і СССР, 4) Запрапанаваць дыплёматычным і консульскім прадстаўнікам Кітайскай рэспублікі ў СССР зараз-жа пакінуць тэрыторыю СССР. Разам з тым Саюзны ўрад заяўляе, што ён захоўвае за сабою ўсе правы, што вынікаюць з пекінскае і мукдэнскае згод 1924 году.

Прыміце і інш.
Л. КАРАХАН».

БАНДЫЦКІ ЗАХОП К.-УСХ. ЧЫГУНКІ НЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЧЫМСЬЦІ НЯЗВЫЧАЙНЫМ

НАГЛАЯ ЗАЯВА ЧАН КАЙ-ШЫ

ШАНХАЙ, 17. Бюро друку Гаміндану публікуе поўны тэкст заявы з поваду канфлікту з СССР, якую зрабіў Чан Кай-шы ў цэнтральным камітэце гаміндану. У заяве зазначаецца:

«Замежная палітыка нацыянальнага ўраду імкнецца аслабаніць Кітай ад путаў і набыць пэўныя правы і прывілеі, якія па справядлівасьці належаць нам. Інтарэсы III-га Інтэрнацыяналу сутыкаюцца з інтарэсамі Гаміндану; інтарэсы нашае партыі сутыкаюцца з інтарэсамі ўсякай імпэрыялістычнай дзяржавы. Мэта нашай праграмы — зьнішчэньне няроўнапраўных дагавораў — будзе, аднак, ажыцьцёўлена. Мы маем пэўную праграму ў поўную процілегласьць камуністам, якія вядуць палітыку рабаўніцтва і забойства; гэта палітыка ніколі ня можа быць прынята дзе-б гэта ні было ў сучасным сьвеце.

Ва ўзаемаадносінах паміж Кітаем і СССР існуе шмат нявырашаных пытаньняў, якія чакаюць свайго ўрэгуляваньня. Што датычыць КУЧ, дык савецкі ўрад ня раз заяўляў аб сваім намеры перадаць чыгунку Кітаю, але ён толькі стараецца ўзмацніць сваё ўладаньне чыгункаю. Таму чырвоны імпэрыялізм зьяўляецца больш небясьпечным, як белы. **Нашыя крокі накіраваны да таго, каб узяць КУЧ у свае рукі і гэта ня мае ў сабе нічога нязвычайнага.** Калі савецкі ўрад паважае сувэрэнітэт Кітаю і згодзен заключыць дагаворы на падставах поўнае роўнасьці і ўзаемнасьці, дык мы гатовы аднавіць дыплёматычныя зносіны з савецкім урадам. Апрача пытаньня аб КУЧ, існуюць яшчэ і іншыя важныя пытаньні, якія павінны быць урэгуляваны; пытаньні, якія датычаць Манголіі і камуністычнае прапаганды, павінны зараз-жа быць абгавораны. **Мы хочам, аднак, спачатку ўзяць у свае рукі КУЧ, а потым прыступіць да абгаварэньня іншых пытаньняў.** Усякая дзяржава, якая прабуе перашкодзіць прагрэсу Гаміндану, няўхільна павінна пацярпець няўдачу. Лёзунгі і прамовы не дадуць нам вынікаў. Наша вялікая сіла заключаецца ў аднаўленьні правоў нашай краіны в мэтаю набыць паважаньне дзяржаў. Мы павінны пабудаваць моцны цэнтральны ўрад».

У баявой гатоўнасьці

Справакаваўны разрыў дыплёматычных і эканамічных адносін з Савецкім урадам, нанкінскія мілітарыстыя нанесьлі цяжкі ўдар інтарэсам кітайскага народу. **Яны яшчэ раз самым бессаромным чынам прадалі гэтыя інтарэсы міжнароднаму імпэрыялізму, які душыць Кітай.** Тым самым яны вельмі значна палегчылі далейшае палітычнае і эканамічнае закабаленьне Кітаю з боку імпэрыялізму, цуты якога можа разарваць толькі пераможная кітайская рэвалюцыя, якая зьмяце за адно з імпэрыялістымі і ўсіх гаміндананўскіх прыслужнікаў.

Мы ўжо ня кажам пра тое, што, прымусіўшы савецкі ўрад закрыць граніцу і чыгуначныя зносіны, гаміндананўскія мілітарыстыя нанесьлі вялізную непасрэдную эканамічную страту Кітаю. Кітайскі народ не забудзецца пра тыя злачынствы, калі ён прад'явіць, нарэшце, свой палітычны рахунак гаміндананўскім катам.

Працоўныя масы Савецкага Саюзу ў гэтыя дні, калі іх краіне быў кінут правакацыйны выпад, ясна паказалі ўсяму сьвету, што яны не пацярпяць парушэньня сваіх заваяваных правоў, што яны змогуць даць моцны ўдар ўсякаму гвалтаўніку, які папрабуе сарваць вялізную работу мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ў савецкай краіне. Працоўныя Савецкага Саюзу з поўнай згодаю прымуць тыя рашучыя меры абароны, якія прыняў савецкі ўрад у адказ на правакацыю. Але мы не гарантаваны ад далейшае правакацыі. За кожным рабаўніком і бандытам, якія прабуюць сарваць мірнае будаўніцтва Савецкага Саюзу, стаяць сілы міжнародных імпэрыялістычных драпежнікаў і іх сацыял-дэмакратычных прыслужнікаў. **За бандытам Чан Кай-шы тоіцца тая самая рука, якая 2 гады таму назад ўтойвалася за бандытам Чжан Цзо-ліам, што зрабіў тады налёт на Пекінскае паўнамоцнае прадстаўніцтва,** супроць чаго, дарэчы сказаць, у той час рашуча пратэставаў сам Чан Кай-шы. **І гэта рука будзе нясупынна працаваць супроць СССР на захадзе і на ўсходзе з боку Манчжурыі і з боку Польшчы, з боку Пэрсіі і з боку Аўганістану, адусюль, адкуль яна толькі зможа нанесьці нам удар.** Мы не гарантаваны ад новых правакацыйных учынкаў з боку нанкінскіх захопнікаў, у першую галаву з боку тых расійскіх белагвардзейскіх атрадаў, якія яны сабралі і ўзброілі на нашай усходняй граніцы.

Працоўныя масы Савецкага Саюзу, якія так хутка і аднадушна ўзьняліся на абарону сваёй краіны, будуць далей, дзень за днём працягваць работу сацыялістычнага будаўніцтва. Недарма, такія вялізныя разьмеры іменна за апошнія дні прыняла падпіска на новую пазыку індустрыялізацыі. Рабочыя і працоўныя масы краіны добра разумеюць, што кожны крок наперад па шляху далейшае індустрыялізацыі ўзмацняе таксама абароназдольнасьць краіны павялічвае тыя рэсурсы, з якімі яна зможа весьці барацьбу супроць імпэрыялістычных драпежнікаў. Наглая правакацыя Чан Кай-шы—ня першая, але і не апошняя правакацыя па адрасу Савецкага Саюзу—дае яшчэ адно пацьверджаньне правільнае генэральнае лініі партыі, разьлічанай на максімальна шпаркі тэмп індустрыялізацыі, дае яшчэ адно ўгрунтаваньне баявому лёзунгу партыі: **эканамічна дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны.** З гэтым лёзунгам партыя пойдзе далей, яшчэ шчыльней згуртоўваючы вакол сябе працоўныя масы на чале з пралетарыятам, яшчэ мацней узбройваючы іх энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва, узмацняючы сувязь з рабочымі і працоўнымі ўсяго сьвету, бязьлітасна перамагаючы ўсякія хістаньні, усякае капітулянства, панікёрства і ліквідатарства.

(«Правда»).

15.000 менскіх пралетараў вышлі на вуліцу

Пралетарскую дзяржаву мы абаранялі і будзем абараняць на ўсіх франтох

Магутны людзкі паток

З цесных пакояў, клюбаў і куткоў, магутная хваля абурэньня і пратэсту супроць бандыцкага нападу кітайскае ваеншчыны на К.-Усх. чыгунку вылілася ўчора на пыльныя вуліцы гораду.

Не пасьпеў яшчэ прагучэць апошні гудок заводаў, як магутны людзкі паток накіраваўся на Пляц Волі, які ня раз быў сьведкаю вялікага пратэсту, вялікага гневу мас.

Да 6-й гадзіны ўвечары людзкое мора затапіла вялікую тэрыторыю пляцу. Дзесяткі аркэстраў, сотні сьцягаў і лес насьпех зробленых плякатаў...

«У адказ на напад імпэрыялістых узмацнім індустрыялізацыю краіны», «Выпусьціць 3-ю пазыку індустрыялізацыі», «Няхай жыве рэвалюцыя ў Кітаі», «Проч гаміндананўцаў—здрадніку рабочае клясы» — крычалі шматлікія лёзунгі в сотняў плякатаў.

Больш 15.000 чалавек прышлі на пляц выказаць сваю салідарнасьць з партыяй і ўрадам, падкрэсьліць мірныя настроі рабочай клясы, якая занята будаўніцтвам новага жыцьця, гатоўнасьць пралетарыяту абараніць свае заваёвы, сваю мірную працу, ня спыняючыся перад самымі рашучымі мерамі. Усхваляваныя, выбітыя падзеямі з нармальнага будаўнічага жыцьця, шматтысячны натоўп прагна слухаў словы прадстаўнікоў партыйных, прафэсіянальных і грамадзкіх арганізацый, слухаў, каб разразіцца бурным «ура» і крыкамі «Няхай жыве Камінтэрн», «Няхай жыве пяцігодка».

Учора была парушана звычайная традыцыя нашых дэманстрацый. Вядомая менскаму пралетарыяту трыбуна на Пляцу Волі ня справілася з работаю, не хапала ёй голасу, каб ахапіць 15-тысячную масу. Ёй дапамаглі тры бальконы.

Маса паслала на бальконы сваіх дэлегатаў, паслала сказаць, — «няхай сусьветныя імпэрыялістыя не разьлічваюць на тое, што ў рабочай клясы СССР высах порах у парахаўніцах. З агнём жартаваць нельга. Кітайскія бандыты і белагвардзейскія наймітыі забываюць, што рабочая кляса ў дні голаду і холаду змагла абараніць сваю бацькаўшчыну ад узброеных да зубоў імпэрыялістых, яна выканае свой абавязак і зараз.

Гаварылі рабочыя розных прафэсій, розных прадпрыемстваў—будаўнікі, харчавікі, чыгуначнікі, мэталісты, дрэваапрацовачнікі, гаварылі на розных мовах—на ўкраінскай, польскай, беларускай, расійскай, па рознаму выкладвалі тыя думкі, тыя пачуцьці, якімі жывуць паслушныя іх рабочыя; але ўсе зышліся на адным: **«Не дапусьцім зьдзекаў над рабочай клясай; даволі маўчаць; у патрэбны момант мы пакінем варштаты і возьмем стрэльбы».**

Рабочы заводу «Энэргія» — кітаец, І-Я-пана заявіў, што кітайскія рабочыя, што жывуць у СССР, падтрымаюць Савецкі ўрад.

Не забыліся працоўныя Менску і пра фашысцкі ўрад Пілсудзкага. Дэлегатка на Варшаўскі зьезд тав. Буткевіч, рабочы-дрэваапрацовачнік Дабравольскі спынніся на забароне нашым дэлегатам праезду на варшаўскі зьезд. Яны адзначылі, што фашысцкі ўрад Пілсудзкага не адважыўся пачуць праўду пра СССР, што пажаданымі гасьцямі на зьезд зьяўляюцца толькі прадстаўнікі эксплёататараў, што зьезд павінен аб'яднаць польскую буржуазію для падрыхтоўкі нападу на СССР.

— Напад кітайскіх імпэрыялістых і махінацыі польскіх фашыстых маюць адну мэту — справакаваць вайну. Мы адкажам на гэтыя правакацыі дружнай падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі краіны.

Аб гэтым прасілі перадаць ураду дэманстранты, гэта зафіксавана ў рэзалюцыі, якая выклікала бурнае «ура» і за якую галасавалі звыш 15.000 пралетараў.

Б—ў.

Калі загудзелі гудкі...

Загудзелі гудкі. Трывожна завылі сірэны. Магутная сымфонія заводаў ускалыхнула рабочыя акраіны. Ляхаўка забурліла. Невялічкія вуліцы запоўніліся стройнымі калёнамі дэманстрантаў. Рабочыя-мэталісты з «Энэргіі», гарбары з «Бальшавіка», харчавікі з «Чырвонай Зары» выйшлі на дэманстрацыю пратэсту...

Першымі выйшлі рабочыя «Энэргіі». Проста з работы, у рабочай вопратцы, з плякатамі і лёзунгамі.

— Братэрскае прывітаньне працоўным Кітаю!

— Па першым закліку ўсе, як адзін, станем на абарону Сацыялістычнай бацькаўшчыны!

— Няхай жыве сацыялізм!..

Гучэлі песьні. Хваля бадзёрасьці і ўпэўненасьці ў перамозе захлябнула рады дэманстрантаў. Рабочыя «Бальшавіка» ішлі разам з чырвонаармейцамі і камандзірамі. Шлі стройнымі радамі. Ціха. Спакойна. Мерна. Стваралася моцнае ўражаньне. Ня верылася, што гэтыя людзі — рабочыя і работніцы, якія некалькі хвілін таму назад стаялі каля варштатаў. Камсамольцы з «Бальшавіка» нясьлі вялікі плякат. На плякаце чырвонымі літарамі: — «Та-дао Го-міньдань! Та-дао Чан-Кай-шы!» «Прэч Гаміндан!» «Прэч Чан Кай-шы!» Пратэст мае гучэй проста і грозна.

* * *

Сотні тысяч працоўных палякаў абіралі дэлегацыю на Варшаўскі зьезд. Арганізацыйны камітэт не дапусьціў савецкую дэлегацыю ў Варшаву. Прыслужнікі фашызму — арганізатары зьезду спалохаліся савецкіх дэлегатаў. Не захапелі каб прадстаўнікі польскага працоўнага насельніцтва СССР расказалі польскім рабочым і сялянам праўду аб сацыялістычным будаўніцтве.

Бандыцкі налёт на К.-Усх. чыгунку і недапушчэньне савецкай дэлегацыі на зьезд зарубежных палякаў — два гістарычныя факты. Факты, якія накіраваны супроць Савецкага Саюзу. Супроць рэвалюцыі. Факты, якія выклікалі вялікае абурэньне рабочых мас.

Пралетарыят Менску дэманстраваў сваё абурэньне паводзінамі польскіх фашыстых. Па вуліцах Менску прадэфілявалі тысячы рабочых і работніц, вузаўцаў, камсамольцаў, рабфакаўцаў...

Дзесяткі плякатаў, сотні лёзунгаў пратэставалі:

— Прэч польскіх фашыстых. Няхай жыве польская камуністычная партыя!..

— На антысавецкія выпады польскіх капіталістых адкажам выкананьнем пяцігадовага пляну.

* * *

Рабочыя-будаўнікі не чакалі гудкоў. У вапецканай мелам і вапнаю вопратцы в друдным ды гліны рукамі прышлі менскія будаўнікі на мітынг. Плякатаў напісаць не пасьпелі. На пабудовах — кожная хвіліна дорага каштуе. Будаўніцтва ў разгары. Пасьпелі напісаць на фанэры толькі адзін невялічкі лёзунг: «Да абароны краіны Саветаў—гатовы!».

Транспартнікі на мітынг ня прышлі, а прыехалі. Прыехалі на грузавых аўтамабілях, упрыгожаных чырванаю лёзунгаў...

Рабочыя заводу **«Камунар», «эльводаўцы», дрэваапрацоўшчыкі,** гутнікі з **«Пралетара»,** работніцы з **«Беларускі»** навадніілі цэнтральныя вуліцы. У арганізаваным парадку пад гукі аркэстраў прыходзілі на мітынг. Адзіная воля мас, адзіны магутны парыў, адзіная калектыўная думка:

— **Задушыць рэспубліку рабочых і сялян не дазволім. Яснавельможныя паны і кітайскія бандыты атрымаюць адпор.**

— Заўсёды ў любую хвіліну пакінем варштаты і машыны і будзем з вінтоўкай у руках абараняць заваёвы Кастрычніка.

І калі... у цішыні наступіўшага вечару з нявысокай дрэўлянай трыбуны прагучэлі словы рэзалюцыі пратэсту, тады дзесяткі тысяч рук узьняліся ўверх. Рэзалюцыя пратэсту была зацьверджана аднагалосна.

Т—к.

Рэзалюцыя пратэсту, ухваленая працоўнымі гор. Менску

Працоўныя гораду Менску у колькасьці 15 тысяч чал. сабраўшыеся на мітынг пратэсту супроць наглага бандыцкага налёту на КУЧ і недапушчэньня дэлегацыі працоўных палякаў СССР на варшаўскі зьезд палякаў заяўляюць:

Кітайскія мілітарыстыя, карыстаючыся нашай цярплівасьцю пад дыктоўку міжнароднага капіталу, ужо некалькі раз парушалі ўмову падпісанную ў 1924 годзе. Разбойніцкі налёт на нашае прадстаўніцтва, зьдзекі над савецкімі прадстаўнікамі і ўрэшце нячуваны па сваёй наглаасьці бандысткі захоп КУЧ, арганізацыя і падтрыманьне белагвардзейскіх банд, канцентрацыя кітайскіх войск на Савецкай мяжы—яўляюцца простым вызавам вайны.

Працоўныя Менску з яшчэ большым здавальненьнем сустрэлі другую ноту Савецкага ўраду, якая пакажа імпэрыялістым Кітаю і ўсяго сьвету, што мы не дадзім парушыць нашыя Кастрычнікавыя заваёвы.

Мы ніколі не аддадзім імпэрыялістым з нашых заваёў ні аднэй пядзі. Мы давялі ня раз, што можам нашы плугі і варштаты ператварыць у штыкі, кулямёты, гарматы і адстаяць заваёвы.

Мы ўступілі ў пэрыяд велізарнейшага сацыялістычнага будаўніцтва і хочам у мірных умовах працягваць справу будаўніцтва сацыялізму, але заяўляем, што па першаму закліку Рабоча-Сялянскага ўраду, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі, усе, як адзін, узброімся і пайдзем на абарону сацыялістычнае бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету —СССР.

Мы ведаем, што пралетарыят і сялянства Кітаю ня хочуць вайны, і мы ўпэўнены, што ў патрэбны момант працоўныя Кітаю выступяць на падтрыманьне пралетарыяту СССР і накіруюць свае штыкі супроць кітайскай буржуазіі.

У гэты час, як у Кітае імпэрыялістыя пачалі адкрытыя, ваенныя дзеяньня супроць СССР—фашысцкая Польшча, шалёна рыхтуецца да нападу на СССР. Пры дапамозе варшаўскага зьезду зарубежных палякаў, пад пёзунгам нацыянальнага адзінства імкнецца яна мабілізаваць усіх палякаў для ўзброеннага нападу на СССР. Пілсудчыкі не далі магчымасьці прадстаўніком 800.000 працоўных палякаў, што жывуць на тэрыторыі СССР, прысутнічаць на гэтым зьездзе, раскрыць мэты і задачы фашыстых і сказаць праўду аб СССР. Гэта забарона ўезду нашае дэлегацыі зрывае маску з твару арганізатараў зьезду

Каб узмацніць нашу магутнасьць, каб адстаяць нашу краіну, мы патрабуем ад нашага ўраду паскорыць выпуск 3-яй пазыкі індустрыялізацыі, як наш адказ Чан Кай-шы, Пілсудскаму і ўсім імпэрыялістым. Мы абяцаем Савецкаму ўраду распаўсюджыць гэтую пазыку поўнасьцю і садзейнічаць скарыстаньню гэтых сродкаў для ўзмацненьня тэмпу індустрыялізацыі краіны. Мы абяцаем дні адпачынку скарыстаць для ўзмацненьня сваёй ваеннай падрыхтоўкі.

На вызаў імпэрыялістых мы адкажам: «Мы да абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны падрыхтаваліся!»

Рукі прэч ад СССР!

Не дамо заваёваў Кастрычніка

Заслухаўшы паведамленьні аб наглым бандыцкім налёце на Кітайска-Усходнюю чыгунку, рабочыя, служачыя і працоўнае насельніцтва м. Асіпавічы рашуча пратэстуюць супроць бандыцкіх налётаў кітайскае ўлады на КУЧ, супроць правакацыйных спроб імпэрыялістых уцягнуць нас у вайну.

Мы заняты будаўніцтвам сацыялізму і вайны ня хочам — заяўляюць працоўныя ў сваёй рэзалюцыі, — але калі на нас нападуць, дык мы ў кожную хвіліну гатовы стаць на абарону заваёваў Кастрычніка. Рукі прэч ад СССР.

Няхай жыве бацькаўшчына рабочых усяго сьвету — Савецкі Саюз.

* * *

Шырокі вайсковы сход чырвонаармейцаў і камандзіраў складу №-скай стралковай беларускай дывізіі, заслухаўшы інфармацыю аб бандыцкім нападзе кітайскіх імпэрыялістых на Кітайска-Усходнюю чыгунку і аб сьцягваньні манчжурскіх войск на межы СССР, рашуча пратэстуе супроць гэтае імпэрыялістычнае правакацыі ўцягнуць СССР у вайну. Сход патрабуе хуткага вызваленьня ўсіх арыштаваных савецкіх грамадзян.

Сход заяўляе савецкі ўрад, што вайскоўцы цьвёрда стаяць на варце заваёваў пралетарскае рэвалюцыі і дадуць рашучы адпор усялякім спробам уцягнуць нас у вайну, адкуль-бы яны ня выходзілі, і па першы заклік савецкага ўраду стануць на абарону сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

— Мы абяцаем і заклікаем усіх чырвонаармейцаў №-скай стралковай беларускай дывізіі да яшчэ лепшага вывучэньня вайскова-тэорэтычнай справы, каб даць адпор сусьветным імпэрыялістым.

* * *

Агульны сход супрацоўнікаў Белкаапсаюзу і яго менскага аддзяленьня ў адказ на разбойніцкія выступленьні кітайскіх імпэрыялістых, у мэтах узмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва, паскарэньня яго тэмпу і ўзмацненьня абароназдольнасьці нашае краіны, пастанавіў усім падпісацца папярэдні на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Амэрыканскі і японскі друк аб падзеях у Манчжурыі

(НАЧНОЕ РАДЫЁ)

НЬЮ-ЁРК, 17. Газ. «Балцімор Сон» піша:

— Хоць дзяржаўны дэпартамэнт (г.зн. міністэрства замежных спраў) і прытрымліваецца нэйтралітэту ў пытаньні аб падзеях у Манчжурыі, аднак, экспэрты па ўсходніх справах зусім ясна заяўляюць, што Савецкі Саюз праў у сваім пратэсту.

Па думцы вашынгтонскіх афіцыяльных асоб, Савецкі Саюз акажа супраціўленьне кітайскай агрэсыўнасьці, зьвярнуўшыся ў выпадку неабходнасьці да сілы. Афіцыяльныя ваенныя колы ў Вашынгтоне зазначаюць, што савецкая армія зьяўляецца адназ з самых магутных у сьвеце, — чырвонаармейцы абучаны вельмі добра, а іх маральны стан найлепшы.

Наогул, пазыцыя ПАЗШ зводзіцца да наступнага:

— ПАЗШ прытрымліваюцца нэйтралітэту, аднак жадаюць, каб СССР атразіў кітайскую агрэсію, якая ўскосна пагражае інтарэсам усіх дзяржаў у Кітаі.

* * *

ТОКІЁ, 18. Газэты друкуюць савецкі адказ Кітаю пад сэнсацыйнымі загалоўкамі. Пры гэтым зьмяшчаюцца партрэты т. т. Карахана, Рыкава, Чычэрына, Траяноўскага (савецкі пасол у Токіё).

**Па думцы колаў японскага генштабу, разрыў адносін паміж СССР і Кітаем ня можа яшчэ неадкладна прывес

КІТАЙСКА-УСХОДНЯЯ ЧЫГУНКА

ДАЎЖЫНЯ І ТРАНСПАРТНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ЧЫГУНКІ

Кітайска-усходняя чыгунка, агульнай даўжынёю ў 2.202 кілёмэтры, мае галоўную лінію, якая пачынаецца ад савецка-кітайскае мяжы на **ст. Манчжурыя** і ідзе праз Паўночную Манчжурыю да мяжы з савецкім Прымор'ем (**ст. Пагранічная**); гэта галоўная лінія мае ад **ст.** **Харбін** адгалінаваньне на поўдзень да **ст. Куанчэнзы** (Чаньчунь), дзе КУЧ злучаецца з лініяй Паўднёва-Манчжурскае чыгункі, якая раней была працягам КУЧ (лінія ад ст. Куанчэнзы адыйшла згодна Портсмутскаму дагавору да Японіі).

Галоўная лінія (**ст. Манчжурыя—ст. Пагранічная**) працягваецца на 1.727 клм., лінія **Харбін—Куанчэнзы—475 клм.**

Такім чынам, КУЧ у двух пунктах злучаецца з чыгуначнай сеткаю СССР (з Забайкальскай чыгункай на ст. Манчжурыя і з Усурыйскай чыгункай на ст. Пагранічная) і ў адным пункце з Паўднёва-Манчжурскай чыгункай, якая знаходзіцца пад уладаю Японіі.

Асноваю грузазвароту КУЧ зьяўляецца перавозка сельска-гаспадарчых прадуктаў, паўднёва-манчжурскага і прыморскага вугалю і інш.; далей транспартнае значэньне КУЧ заключаецца ў транзіце з Сібіры ў Прымор'е, а ў адносінах пасажырскага руху КУЧ зьяўляецца адным з вучасткаў **простых эўрапэйска-азіяцкіх зносін**, злучаючы эўрапэйскія і сібірскія чыгункі з чыгуначнаю сеткаю Кітаю і Карэі (а праз апошнюю—з Японіяй).

Лінія КУЧ ад Харбіна да ст. Пагранічная злучае праз Усурыйскую чыгунку важнейшыя цэнтры Паўночнае Манчжурыі з Уладзівастокскім портам (ад Харбіна да Ўладзівастока 490 міль); да другога бліжэйшага порту,—іменна Дайрэна, злучанага з Харбінам Паўднёва-Манчжурскай чыгункай і галінаю КУЧ—каля 600 міль.

ГІСТОРЫЯ ПАБУДОВЫ І КІРАЎНІЦТВА ЧЫГУНКІ

Кітайска-Ўсходняя чыгунка пачала будавацца ў 1896 годзе на падставе згоды паміж Кітаем і Расіяй. Агентам расійскага ўраду быў Расійска-Азіяцкі банк, які адыгрываў, аднак, чыста фіктыўную ролю, бо ўсе сродкі на пабудову чыгункі і ўвесь капітал заснаванага акцыянэрнага т-ва былі прадастаўлены расійскім урадам.

Статут чыгункі прадастаўляў самыя шырокія правы расійскаму ўраду і вельмі абмежаваныя Кітаю. У моц гэтага статуту ня толькі ўся чыгунка, але і шырокая паласа адчужэньня з усімі гарадамі і паселішчамі апынулася пад кантролем Расіі і на ўсёй тэрыторыі дзейнічалі расійскія ўрадавыя і судовыя органы, на яе распаўсюджваліся расійскія законы. Цікава адзначыць, што хоць паводле таго-ж статуту Кітаю прадастаўлялася назначэньне старшыні «Т-ва Кіт.-Усх. чыгункі», фактычна Кітай ніякага ўплыву на кіраўніцтва чыгункі ня меў і памянёная пасада на працягу ўсяго пэрыяду з 1901 да 1917 году заставалася вакантнай.

Радыкальныя зьмены ў становішчы чыгункі ўнесла Кастрычнікавая рэвалюцыя. У гады грамадзянскае вайны, калі Сібір і Далёкі Ўсход былі адрэзаны ад Савецкае Расіі, на чыгунцы гаспадарылі белагвардзейцы; адзін з «гэрояў» белагвардзейшчыны—вядомы генэрал Харват быў галоўным заправілаю КУЧ аж да 1920 г., калі, пасьля ліквідацыі Калчака, на чыгунцы пачаліся рабочыя хваляваньні і кітайскі ўрад парашыў звольніць Харвата. Далей ідзе пэрыяд з 1920 году да 1924 г., калі, карыстаючыся няпэўным становішчам на чыгунцы, у яе справы ўмяшаўся «Расійска-Азіяцкі банк», або, правільней, яго парыскія рэшткі. Хоць, як зазначана, уся роля гэтага банка ў пабудове чыгункі была фікцыяй, Кітай заключыў з гэтай «былой» арганізацыяй часовую згоду, якая вызначала рэжым чыгункі да 1924 г. У 1924 г. (31 мая) быў заключан дагавор аб КУЧ паміж СССР і пекінскім урадам, а потым 1 аналёгічны дагавор паміж СССР і урадам «Трох Усходніх Правінцый» (Мукдэн, 20 верасьня 1924 г.).



ДАГАВОРЫ ПАМІЖ СССР І КІТАЕМ АБ КІРАЎНІЦТВЕ ЧЫГУНКАЮ

Згодна гэтых дагавораў, які меў моц з 1924 г. аж да апошнята бандыцкага налёту, чыгунка была абвешчана чыста камэрцыйным прадпрыемствам, якое знаходзіцца пад супольным кіраўніцтвам СССР і Кітаю, і ўсе іншыя грамадзкія функцыі, як: судовыя пытаньні, грамадзянская і вайсковая адміністрацыя, паліцыя, мясцовае самакіраўніцтва, падатковае абкладаньне і г. д. перадаваліся цалкам кітайскім ўладам. Урад СССР у тых-жа дагаворах выказаў сваю згоду на выкуп КУЧ урадам Кітаю па сканчэньні тэрміну дагавору, прычым, сапраўдны і справядлівы кошт чыгункі павінен быць вызначан абодвымі бакамі. Тады-ж была падпісана згода аб кіраўніцтве КУЧ.

Паводле гэтае згоды, на чале КУЧ стаіць **праўленьне**, якое складаецца з 10 асоб, з якіх 5 назначаюцца урадам СССР, а 5—урадам Кітаю. Старшынёю праўленьня (ён-жа галоўны дырэктар або дубань) зьяўляецца кітаец, адным з таварышоў старшыні — грамадзянін СССР. Абедзьве гэтыя асобы вядуць супольна справы праўленьня і супольна падпісваюць усе яго паперы. Кіраўніком чыгункі зьяўляецца грамадзянін СССР, а з двух яго памоцнікаў—адзін—грамадзянін СССР, другі—грамадзянін кітайскай рэспублікі. Гэтыя службовыя асобы назначаюцца праўленьнем і зацьвярджаюцца адпаведным урадам. Той-жа прынцып парытэту пакладзен у аснову кіраўніцтва рознымі аддзеламі: калі загадчык аддзелам — грамадзянін СССР, дык яго памоцнікам павінен быць грамадзянін кітайскае рэспублікі і наадварот.

Гэты статут чыгункі меў моц на працягу ўсяго пэрыяду з 1924 г. да апошняга часу, прычым, нармальнае яго ажыцьцяўленьне ад часу да часу перапынялася рознымі гвалтоўнымі актамі кітайскіх улад, як напрыклад, захоп флётыліі, якая належала КУЧ, тэлефоннае маемасьці і г. д.

***

Для таго, каб мець уяўленьне аб разьмерах народных сродкаў, укладзеных Расіяй у чыгунку, трэба адзначыць, што паводле балянсу чыгункі на 1924 г., кошт яе пабудовы вылічваецца каля 400 мільёнаў залатых рублёў.

***

Агляд і чыстка апарату

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА КАМУНБАНКУ

Пралетарскай мятлой вымясьці шкурнікаў і бюракратаў!

„Дробязі", якія ставяць апарат дыбам

(Нататкі брыгадзіра)

„НЯМА ПРАВІЛ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ"

Статут банку забараняе выдачу крэдыту працаўніком банку. Адміністрацыя добра ведае статут, аднак, кіруючыся старой прыказкай «няма правіла без выключэньня», «добраю рукою» выдае крэдыт раду працаўнікоў банку. Мала гэтага, быў намер сьпісаць крэдыт аднаму з працаўнікоў.

КАНТРОЛЮ НАД БУДАЎНІЦТВАМ НЯМА

Кожны год банк адпускае вялікія крэдыты на новае будаўніцтва і павінен ведаць, на што і як грошы гэтыя выдаюцца. З Менску ня ўбачыш, што робіцца ў Магілеве. Трэба туды паехаць, наглядзець. Між тым на працяту ўсяго году 2 інжынэры камунбанку толькі адзін раз выяжджалі ў округі.

Ня лепш абстаіць справа і з непасрэдным кантролем над работай аддзяленьняў банку. Адзін выезд за паўтара гады. Між тым у аддзяленьнях (Віцебскім) былі недарэчнасьці.

РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ СПРАВАВОДСТВА ЦЯГНЕЦЦА КАЛЯ ГОДУ

Эканомкамісія ашчэ ў верасьні мінулага году ўнесла ў мясцком пытаньне аб рацыяналізацыі справаводства. Пытаньне ўсё пераносілася за «позным часам». Ня вырашана яно канчаткова з лёгкай рукі тав. Мусінай і да апошняга часу.

СТАРЫЯ І МАЛАДЫЯ

Не пасьпеў яшчэ сесьці за працу новы працаўнік, як яму даюць параду пакінуць установу.

Так сустрэў тав. Ваксман рабочага-выдучанца т. **Хмялеўскага.** Ня лепш аднёсься т. **Ваксман** і да новага малакодога работніка Ясючэні. «Вам ня быць касірам, а кур'ерам»,—так сустрэў Ваксман Ясючэню—маладога работніка з вёскі.

Ня лепш, калі ня горш, аднёсься і старэйшы касір Несьцяраў да Ясючэні.

У КАСЕ ШТО НІ ДЗЕНЬ, ТО НОВАЕ ЗДАРЭНЬНЕ

Учора хтосьці схаваў у касавую кнігу дзесяцірублёвую паперку аднаго таварыша. Вінаватага не знайшлі. Сёньня ўвечары дзяжурны-міліцыянэр знайшоў вэксаль, які вываліўся з партфэлю старэйшага касіра. Тав. **Ясючэні** даецца незаконна (аб чым тав. Ясючэня зусім і ня ведае) ордэр на атрыманьне грошай па апратэставаньні вэксаля, Ясючэня зусім не вінаваты, а Несьцяраў—здаволены, што малады працоўнік «уліп».

«НЕ ПРЫЗНАЮ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ»

Як правіла, у камунбанку не пачуеце беларускае мовы. Законы ўраду па нытаньні беларусізацыі камунбанку не датычаць, калі ня лічыць перапіскі, якую ня так даўно пачалі весьці на беларускай мове.

Мала таго, што ў камунбанку не пачуеце беларускае мовы, знойдуцца ў банку і такія працаўнікі, якія ня хочуць і чуць беларускае мовы. Да такіх працаўнікоў адносіцца т. **Сокал.** Кліент зварочваецца да Сокала на беларускай мове, а той прапануе яму гаварыць парасійску—бо «не понимаю».

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ ДА СПРАВЫ

Запушчаны справы ў аддзеле бягучых рахункаў. Папраўкі робяцца ня чырвоным, а чорным атрамантам (**тав. Мусіна**).

Кліенту заяўляюць, што ў банку вэксаля няма, ў той час калі вэксаль ляжыць у банкаўскім стале (**т. Сокал**).

ВЕЧНАЯ ЧАРГА Ў АДДЗЕЛЕ МЯСЦОВАГА КАШТАРЫСУ

Тысячны натоўп бамбардыруе аддзел мясцовага каштарысу ў часе выплаты зямельнае рэнты (па лініі Акрфа). На працягу 4-5 дзён у камунбанку шум, крыкі, кірмаш, усё гэта сьпыняе работу камунбанку. За ўвесь час ніхто не падумаў, каб рацыяналізаваць гэтую справу праз вызначэньне пэўных тэрмінаў аплаты рэнты асобнымі групамі насельніцтва ў альфабэтным парадку.

***

Шмат яшчэ ёсьць такіх «дробязяй» у камунбанку, якія перашкаджаюць нармальнай працы і ставяць апарат дыбам.

МАЗУР.

Людзі, якім ня месца ў Камунбанку

(Паводле матар'ялаў абсьледвацельскай брыгады)

Ваксман—прыхільнік амэрыканскіх пародкаў

Ваксман С. Я. — заг. вучотна-ссудным аддзелам банку — зусім ня хоча навучаць моладзь банкаўскай справе, і ён аб гэтым зусім адкрыта заяўляе па старонках насьценгазэты, матывуючы, што навучаньне ў яго абавязкі не ўваходзіць. Нічога ня значыць Ваксману назваць «балдой» кур'ера, які абслугоўвае аддзел, і быць грубым з кліентурай. Пытаньнямі рацыяналізацыі ён зусім ня цікавіцца. З вялікай стараннасьцю агітаваў Ваксман супроць калектыўнай пастановы аб падпісцы на пазыку, зрываючы такім чынам пасьпяховасьць правядзеньня гэтага важнага мерапрыемства. У вызнаку са справаю Баршай, Ваксман выказаў на дзіва арыгінальную думку: «калі-б я быў там, дык я-б усіх... пераразаў». Потым ён вельмі сумаваў, што ня мае магчымасьці выехаць у Амэрыку, бо існуючыя там парадкі ён лічыць лепшымі. Да партыйцаў у Ваксмана асабліва антыпатыя, паводле яго слоў: усе партыйцы — шкурнікі. Дарэмна, аднак, Ваксман так адносіцца да партыйцаў, некаторыя з іх адносяцца да яго зусім інакш. Возьмем для прыкладу кіраўнікоў банку: яны вось лічаць, што за ўсе яго ўчынкі, ён варты толькі... папярэджаньня аб выняцьці з работы... Такая дзіўная настанова не бальшавіцкая, а эвангельская: ён табе ў правую, падстаў яму левую...

Кірштэйн клапаціцца аб панчохах

Пры такім настроі ў банку зусім ня дрэнна жывецца, так званаму, эканамістаму **Кірштэйну.** Папершае, пераходзіць ён з установы ва ўстанову разам са сваім патронам-дырэктарам банку тав. **Васкабойнікавым.** Іх рэйс такі — Галоўкамгас — Белаўтапрамторг — Камунбанк. За ўвесь час сваёй работы ў банку Кірштэйн займаецца ўсім, чым хочаш, але ня сур'ёзнай эканамічнай работай. У справах у яго непарадкі. Кліентам адказы даюцца не заўсёды своечасова. Свае асабістыя справы Кір-я робіць як нельга лепш. Окарыстоўваючы службовае становішча, ён з посьпехам крэдытуецца ў гомельскім раббанку, арганізуе выпіску панчох праз Віцебскае аддзяленьне банку. Наяўнасьць у яго маткі ўласнага дому в некалькімі кватэрамі, ніколькі не перашкаджае Кірштэйну займаць месца ў дамах жакта, уваходзіць у органы праўленьня іх, скарыстоўваючы гэта ў мэтах асабістых выгад (рамонт кватэры, атрыманьне дармовых камунальных паслуг). Як савецкага работніка, Кірштэйна ведаюць многія, за добрага балбатуна і малапрадукцыйнага работніка.

„Птушка" Цыянцоў і яго кандытэрская

Далей, прыходзіцца толькі дзівіцца, як мог трапіць у апарат банку ацэнщыкам такая «птушка», як **Цыянцоў Н. А.** — былы манархісты, наркоўнік і ўласьнік буйнейшай у Менску кандытэрскай. Многія менчане ведаюць гэтую кандытэрскую, але вельмі мала хто ведае, што гэта кандытэрская служыла некалі базай для сьлежкі ахраньнікаў за роднымі асобамі. Цыянцоў быў самым цесным чынам зьвязаны з сакратаром «Минского Слова» Маркам Шэфэравым, які зьяўляўся асабістым агентам шэфа жандараў Курлава. Праз Цыянцова ішло грашовае задобрываньне Шафэрава менскім гарадзкім крэдытным таварыствам за маўчаньне аб справах таварыства, у якім Цыянцоў служыў ацэнщыкам.

Вялікай недарэчнасьцю трэба лічыць знаходжаньне такога чалавека ў радох служачых дзяржапарату.

Справы Мусінай

Мусіна Б. Д. чамусьці зусім ня хоча працаваць па сваёй асноўнай спэцыяльнасьці акцыэркі, хаця на такіх спэцыялістых, дый яшчэ да таго партыйцаў, ёсьць не малы попыт на бёсцы. Яна абрала сабе больш чыстую — банкаўскую справу. Тая акалічнасьць, што яна неакуратна вядзе кнігі, дапускае розныя выпраўленьні ў іх, немагчыма грэба і бюракратычна адносіцца да наведвальнікаў, пакідае ключы ля сакрэтнае скрыні і ўходзіць дамоў — усё гэта, аднак, не перашкаджае ёй працаваць у банку, пры наяўнасьці нашат прыхільных адносін да ўсяго гэтага дырэкцыі банку, якая знаходзіць Мусіну ўсё-ж незамянімай работніцай. Мусіна наогул нарадзілася, відаць, пад шчасьлівай зоркай, бо акрамя гэтага яна магла зьяўляцца таксама членам бюро ячэйкі і старшынёю МК у банку і ў той жа час зажымаць самакрытыку, правальваць рацыяналізатарскія прапановы, скажаць самым бессаромным чынам прафдэмакратыю, удзельнічаць у зьдзеках Ваксмана з практыкантки, наладжваць скандалы пры дзяльбе панчох, выпісаных праз Віцебскае аддзяленьне банку, праяўляць шавіністычныя настроі, атрымліваць незаконна ліквідацыйныя грошы, наладжваць сабе паездку на курорт, праводзіць прафработу за сьпінаю калектыву (дзяржнармаваньне), ганарыста трымаць сябе ў адносінах да паасобных членаў калектыву, парушаць пастанову калектыву і падпісацца на сялянскую пазыку замест 5 проц. на 3 проц. зарплаты, зрываючы гэтым пасьпяховасьць падпіскі і г. д.

Вось, якое шматграннае аблічча Мусінай! Такім асобам, якія, ўмела прыкрываючыся ідэалёгічна вытрыманай фразай, самым агідным чынам скажаюць дырэктывы партыі і дрэнна працуюць наогул, ня месца ў савецкім апараце, тым больш у радох партыі.

Аб гэтых «вялікіх бюракратах» мы чакаем рашучага слова ад камісіі па чыстцы. На такіх людзей мы ня можам спадзявацца, выконваючы нашу складаную работу па сацыялістычным будаўніцтве.

БАНКАВЕЦ.

Хутчэй выпусьціць 3 пазыку індустрыялізацыі

Папярэдняя падпіска дасягнула ўжо сотні тысяч руб.

Адозва рабочых чырвонаштандартнае гарбарні „Бальшавік" да ўсіх рабочых Беларусі

Заклік рабочых ленінградзкага суднабудаўнічага заводу аб выпуску і папярэдняй падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі спаткаў гарачае спачуваньне сярод рабочых чырвонаштандартнае гарбарні «Бальшавік».

Амаль кожную гадзіну паступаюць заявы паасобных груп рабочых нашага заводу з патрабаваньнем тэрмінова выпусьціць 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Рабочыя адначасова падпісваюцца на месячны заработак і больш. На нашым заводзе створана камісія садзейнічаньня папярэдняй падпісцы на будучую пазыку, арганізаваны ініцыятыўныя групы рабочых.

Рабочыя гарбарні «Бальшавік» лічаць, што выпуск 3-й пазыкі індустрыялізацыі павінен паслужыць адказам рабочай клясы на пагрозы і правакацыю ворагаў рэвалюцыі.

Мы зьвяртаемся да ўсіх рабочых Беларусі з заклікам арганізаваць на сваіх прадпрыемствах папярэднюю падпіску на будучую пазыку.

Адначасова мы прапануем усім рабочым гарбарань і абутковых прадпрыемстваў Беларусі, якія з намі заключылі сацыялістычны дагавор, уступіць з намі ў спаборніцтвы па падпісцы на 3-ую пазыку.

За два дні падпіска на гарбарні «Бальшавік» дала 8.000 руб.

Бюро парткалектыву.
Бюро калектыву ЛКСМБ.
Заводзкі камітэт.
Заводакіраўніцтва.
Рэдкалегія газэты «Рабочае Вока».
Заводзкая ашчадная каса.

Пачын зрабіў рабочы Фрыдман

Ён сабраў падпіскі на суму каля 2.000 руб.

Мазыр (наш кар.). Пленум акрвыканкому прыняў спэцыяльнае рашэньне патрабаваць выпуску 3-й пазыкі. Ужо зараз на радзе прадпрыемстваў і ўстаноўпачалася папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Першы пачын зрабіў рабочы складу Мазырскага аддзяленьня Гомспажаю-

зу т. Фрыдман, які сам падпісаўся на месячную зарплату і правёў сярод супрацоўнікаў аддзяленьня падпіску на 2.000 руб.

Калектыў супрацаўнікоў акрфінаддзелу правёў падпіску на 3.000 р.

Б

Пленум Аршанскага АВК прапануе выпусьціць 3-ю пазыку

Удзельнікі пленуму падпісаліся на 4.000 руб.

Пашраны пленум Аршанскага акруговага выканаўчага камітэту разам з прадстаўнікамі прафарганізацыі і чырвонаармейскіх часьцей, у асобнай пастанове прызнаў, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне 5-ці галовага пляну можа быць дасягнута толькі пры ўмове росту актыўнасьці рабочых мас і мабілізацыі праз пазыкі фінансавых рэсурсаў.

Пленум пастанавіў прасіць урад СССР у самы хутчэйшы тэрмін выпусьціць 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Удзельнікі пленуму падпісаліся на пазыку на 4.000 рублёў і зьвярнуліся да працоўнага насельніцтва акругі з прапановай абгаварыць пытаньне аб выпуску 3-яй пазыкі і арганізаваць папярэднюю падпіску.

чаму я палічыў лепшым нічога не гаварыць.

***

Адначасова з капыльскімі трэба памянуць і менскіх бюракратаў бядушных і галавацяпаў.

Старэйшы інспэктар працы т. **Таўкачоў** (пасьля расьсьледваньня справы **Грынюка** інспэктарам т. Яропам у Капылі) налажыў рэзалюцыю: «Адмяніць пастанову РКК і прапанаваць Грынюку зьвярнуцца ў суд». Назаўтра той-жа **Таўкачоў** закрэсьліў гэту рэзалюцыю і налажыў новую: «Пастанову РКК зацьвердзіць». Такім чынам бязглуздую пастанову прыкрыла другая аўтарытэтная ўстанова. Пасьля гэтага ў ЦП саюзу працасьветы з Грынюком, як «з варожым элементам» і гаварыць не захацелі. Аўтар гэтых радкоў зьвярнуўся ў ЦП да т. **Мельніка** з запытаньнем: «за што зволілі Грынюка і далі «воўчы білет» аб варожасьці да сучаснасьці?» Тав. **Мельнік** узяў у мяне томік—«Справу Грынюка» і хутка знайшоў там маленькую паперку, потым т. **Мельнік** азірнуўся наўкола, запытаўся наконт мае партыйнасьці і ціха прачытаў... паказаньне настаўніка Голуба. А потым дадаў:

— Мы ня можам абараняць такіх тыпаў.

Іншыя «дакуманты» т. Мельніка ня цікавілі. Ня цікавіў і жывы член саюзу Грынюк і яго заява.

Нам прышлося гэты клубок разблытваць.

***

У сувязі са справай Грынюка карысна праверыць наогул якасьць працы капыльскага райкому партыі. Падамо пару фактаў. Загадчык фінчасткай РВК партыец—**Гурскі**, як партыец разлажыўся. Ён сыстэматычна п'янстваваў, быў распусьнік і нарэшце зрабіў вялікую растрату дзяржаўных грошай. Гурскі арыштаваны. Вядзецца сьледзтва. Райком даручае члену райкому, вядомаму нам Мінцу, сабраць па падпісным лісьце грошы, каб пакрыць растрату Гурскага. Другі факт. Пры вёсцы Кулакі, Лішнянскага сельсавету, Капыльскага раёну знаходзіцца ўрочышча «Карчы». Там 80 гектараў зямлі—няўдобіцы, якая залічана ў запасны фонд. Па ініцыятыве сялян-актывістых **Бунека** Хамы і **Фінкевіча** Базыля, пры актыўнай дапамозе вучасткавага агранома т. **Адліванчыка** і настаўніка школы т. **Паўлоўскага** было арганізавана мэлярацыйнае таварыства ў пачатку сакавіка т. г. Уся справа была пакіравана ў Капыльскі РВК для зацьверджаньня таварыства. Разам з гэтым арганізатары таварыства прасілі перадаць для распрацоўкі балота ва ўрочышчы «Карчы».

Замест таго, каб прывітаць такую ініцыятыву, «Капыльскія аўтарытэты» трымалі пратакол сходу да 31/V без ніякага руху і паведамленьня сялян. Пасьля гэтага зацьвердзілі таварыства і паслалі арганізатарам ультыматум літаральна такога зьместу: «Арганізуйце калектыў, тады дамо вам зямлі з узнагародай».

Такім чынам капыльскія бюракраты разьбілі першую спробу сялян стаць на шлях калектывізацыі. Разьбілі першую форму да калектывізацыі.

А балота ў 80 гакт. і цяпер застаецца балотам. Сяляне такімі паводзінамі РВК вельмі абураны.

Трэба праверыць, як праводзіцца практычная работа ў Капыльшчыне на ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.

П. Ізох.

За межамі ідзе вялікая падрыхтоўка да 1 жніўня

У дзень 1 жніўня—рабочыя усіх краін будуць дэманстраваць сваю салідарнасьць з пралетарамі СССР

СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ! НА АБАРОНУ СССР!

8 дзесяткаў краін, пачынаючы з далёкай Японіі і Амэрыкі, і канчаючы суседняй Польшчай, прарываючыся праз лютую цэнзуру фашыстых, кружнымі дарогамі прыходзяць да нас кожны дзень лісты замежных рабкораў. У гэтых лістох рабочыя расказваюць аб той вялікай падрыхтоўцы, якая зараз ідзе за межамі да 1 жніўня.

Гэтыя лісты прасякнуты вялікай любоўю да Савецкага Саюзу, гатоўнасьцю змагацца за Савецкі Саюз, цягай да збліжэньня, да больш цеснай непасрэднай сувязі з нашымі рабочымі.

Вось пераглядваем гэтыя лісты і нібы бачыш, як добра рыхтуюцца да 1-га жніўня замежныя таварышы. З якой цікавасьцю рабочыя чакаюць гэтага дню—«калі мы зможам прадэманстраваць свае сілы, сваю гатоўнасьць да клясавых бояк супроць імпэрыялізму».

Што-ж кажуць гэтыя лісты?

«МЫ БОЛЬШ НЯ МЯСА ДЛЯ ГАРМАТ»

— «9.200.000 забітых, 19½ мільёнаў раненых, мільярды страт, мора сьлёз—прынесла вайна. Пад ботамі нямецкіх імпэрыялістых была зруйнавана наша краіна,—так піша бельгійскі вуглякоп **Жан Борд.**—Мы ўсе памятаем добра вайну, якая нічога ніводнаму пралетару, акрамя ран альбо мыліц, не дала. Прайшло мала часу, але капіталістыя ўжо зноў рыхтуюцца да вайны. Гэту вайну яны рыхтуюць супроць сваіх ранейшых саюзьнікаў (бачыце, як лёгка яны гэта ўсе мяняюць!) рабочых і сялян Савецкага Саюзу. **Гэтай вайне ня быць!**—кажам мы, «нушачнае мяса» імпэрыялістычных армій. **Мы больш ня хочам быць гэтым мясам.** Першага жніўня мы пакажам буржуазіі, з кім мы і за каго. Няхай не стараюцца дарэмна буржуазныя прыслужнікі — сацыял-дэмакраты—ім усё менш і менш верыць рабочыя.

Каб лепш падрыхтавацца да 1-га жніўня, пралетары Бельгіі, Нямеччыны, Францыі, Галяндыі і Люксэмбургу склікаюць на 21 ліпеня ў Экс-ля-Шанэйне папярэднюю маніфэстацыю, у якой прымуць удзел делегаты рабочых вышэй названых краін. Гэту папярэднюю дэманстрацыю мы склікаем у адказ на антысавецкую хлусьню буржуазіі і сацыял-дэмакратаў, для падрыхтоўкі 1-га жніўня абароны нашай бацькаўшчыны СССР!»—так піша **Жан Борд.** Яго дапаўняе марсэльскі рабочы (Францыя)—мэтальіст **Жан Урыб.**

«НІ КУЛІ, НІ ГАЗЫ НЯ СПЫНЯЦЬ НАС»

«Па ўсёй краіне,—піша ён,—ідзе вялікая падрыхтоўка да 1-га жніўня. У газэтах кампартыі адводзіцца шмат месца для падрыхтоўчых матар'ялаў і інструкцый. Фабрычныя газэты заклікаюць рабочых да ўдзелу ў дэманстрацыі. Склікаюцца папярэднія сходы, мітынгі, на якіх бывае шмат рабочых. Газэты буржуазіі і сацыял-дэмакратыі сумесна нападаюць на кампартыю за яе падрыхтоўку. Яны абяцаюць сумеснае выступленьне супроць нас. Мы ведаем, чым пахне гэта выступленьне! Але гэта нас не палохае. Ні кулі, ні газы ня спыняць нас. 1-га жніўня—усе на вуліцы! І гэта мы выканаем».

Так абяцае наш марсэльскі рабочы **Жан Урыб.**

І мы ўпэўнены ў тым, што ён выканае яго, як выканаў ён некалі «свой пралетарскі абавязак у адносінах да сваіх братоў па клясе»—прымаючы ўдзел у паўстаньні маракоў французскага флёту. Тады ён паказаў сваю вернасьць—гэту вернасьць ён пакажа і цяпер!

«ЦЭРГІБЭЛЮ НЯ СПЫНІЦЬ СТАЛЕВЫ ХОД ГІСТОРЫ»

«Памяшканьні нашых парткамітэтаў надобны зараз да вульля пчол. Там ідзе вялікая праца. Кожны камуністы прыходзіць, каб у парткоме выканаць тое, што яму даручыла ячэйка, бо ячэйка ня мае свайго кутка—усім нам прыходзіцца працаваць у маленькіх пакойчыках парткому. Друкуюцца фабрычныя газэты, пішуцца лёзунгі, раздаюцца лістоўкі—заклікі да ўдзелу, даюцца інструкцыі заводзкім ячэйкам, упоўнаважаным, камітэтам па правядзеньні 1-га жніўня і г. д., і г. д. Як толькі канчаецца работа—у камітэце ўжо поўна. І так да ночы. Ноччу разыходзяцца, разносячы тысячы лістовак, адозваў. Па дарозе гэтыя лістоўкі наклейваюцца на сьцены, брамы, дамоў у рабочых кварталах. А заўтра іх сотнямі чытаюць рабочыя заводаў. Паліцыя ловіць тых, хто распаўсюджвае лістоўкі, але ніяк ня зловіць таго, хто іх раскідае па фабрыках. І цяжка злавіць. Цэргібэль рыхтуецца таксама да 1-га жніўня. Ён хоча, відаць, паўтарыць вопыт 1-га мая. Але горача абыйдзецца яму гэта паўтарэньне. Няўжо ён думае і сапраўды кулямі спыніць сталёвы ход гісторыі—магутны марш пралетараў. Гэты нумар зараз ня пройдзе!—піша так берлінскі рабочы **Вілі Вільдэбрант.** Яго словы гучаць пагрозай сацыял-фашыстаму Цэргібэлю і ўсёй сацыял-дэмакратыі, так здрадніцкі прадаўшай інтарэсы рабочае клясы.

— «Годзі,—піша ён далей,—маскі далоў, бо пад імі за прыгожымі лёзунгамі—хаваецца твар фашызму. Сацыял-дэмакратыя ў 1914 годзе сышла в пралетарскага шляху, зараз-жа яна апынулася ў фашысцкай яме. «Форвэртс» зрабіўся падпявалам дзяржаўнага фашызму. І ня яму ужо «абараняць справу рабочае клясы»!

«РАБОЧАЯ КЛЯСА ГАТОВА ПРЫНЯЦЬ БОЙКУ»

З краіны разьюшанага тэрору, з паўдзіёвай Славіі піша **Юры К—іч** у сваім лісьце, які ён паслаў кружным шляхам два тыдні назад:

«Умовы з кожным днём робяцца горш і горш. Зарплаты ледзь хапае на яду, у той час, калі працаваць прыходзіцца на 10-12 гадзін у дзень. Усе рабочыя арганізацыі зачынены, але рэвалюцыйныя рабочыя групоўцца навакол усіх тых арганізацый (супроць алкагольных, музычных і інш.). якія існуюць пакуль легальна. Гэтыя арганізацыі дапамагаюць нашаму адзінству. Мы пачынаем рыхтавацца ўжо да 1-га жніўня—дня пралетарскай дэманстрацыі сіл. У гэты дзень мы пакажам, ня гледзячы ні на што, што жыве рабочая кляса і што яна гатова змагацца за чалавечае жыцьцё тут на зямлі. Яна гатова прыняць бойку!»

«БУДЗЕМ УЗМАЦНЯЦЬ АДЗІНЫ ПРАЛЕТАРСКІ ФРОНТ»

І яшчэ адзін ліст хацеў-бы падаць пад канец. Гэты ліст прыслаў шведзкі рабочы **Нільсон** з Гёнборгу.

«Мы рыхтуемся цяпер да 1-га жніўня. Газэты і радыё прыносяць вам весткі аб гэтым. Дзень баявога адзінства пралетараў—зьяўляецца днём, калі рабочыя усіх краін дэманструюць сваю салідарнасьць з братамі з СССР. Дзень 1-га жніўня—зьяўляецца днём, калі мы павінны пакласьці пачатак нашай непасрэднай сумеснай сувязі, абмен вопытам для падрыхтоўкі надыходзячых клясавых баёў. Вы маеце вялікі багаты вопыт і вы павінны яго перадаць, навучыць нас. Выкарыстоўвайце ўсе магчымыя сродкі сувязі—наладжвайце мацней сувязь з намі. Бо мы вельмі даражым гэтай сувяззю. Няхай словы аб інтэрнацыянальнай сувязі ператвораца ў жыцьцё. Праз галовы нашых ворагаў—мы будзем узмацняць адзіны пралетарскі Чырвоны фронт».

***

Ці-ж атрымліваюць замежныя таварышы водтук ад нас! Ці ведаем мы, як патрэбна і каштоўна гэта сувязь для замежных таварышоў і якое значэньне яна мае для ўтварэньня адзінага фронту?

Справа міжнароднай сувязі чакае а тыўнасьці савецкіх рабселькораў. Ня павінны ў першую чаргу праштурхнуць яе ў масы. Наладжвайце сувязь з замежнымі рабочымі! Супрацоўнічайце з замежнай рабочай прэсе! Узмацняйце адзінства пралетарскіх радоў! У гэтым два тыдні, што засталіся да 1-га жніўня, не забудзьце аб узмацненьні інтэрнацыянальнай работы. Ячэйкі МОПР, эспэранто і ўсе іншыя павінны рыхтавацца да 1-га жніўня—больш актыўна.

Зьм. СЬНЕЖКА.

Рабкоры і селькоры, дапамажэце падрыхтавацца да Міжнароднага Чырвонага Дню

Таварышы!

1 жніўня ва ўсіх краінах арганізуецца Чырвоны Дзень—міжнародны дзень барацьбы супроць імпэрыялістычных войн. У гэты дзень перадавыя рабочыя ўсяго сьвету будуць цеснымі радамі дэманстраваць супроць небясьпекі вайны і ў першую чаргу ў абарону адзінай пралетарскай краіны,—бацькаўшчыны рабочых усяго сьвету—СССР. Рабочыя будуць дэманстраваць сваю волю за недапушчэньне новай імпэрыялістычнай вайны і абернуць яе, калі яна ўзьнікне, у вайну грамадзянскую. Міжнародны Чырвоны Дзень будзе таксама днём усямернага выкрыцьця рэфармістых і сацыял-дэмакратыі, якія зьяўляюцца ў сучасны момант агентамі імпэрыялізму і ня толькі зрываюць барацьбу рабочай клясы супроць вайны, але і актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы новай крывавай вайны.

Міжнародны рэвалюцыйны рабочы рух надае Міжнароднаму Чырвонаму Дню выключнае значэньне. У зьвязку з гэтым усе перадавыя і сьвядомыя рабочыя павінны аддаць свае сілы справе падрыхтоўкі правядзеньня Чырвонага Дню. І ў першую чаргу гэтай справе павінны аказаць усялякае падтрыманьне і садзейнічаньне РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ДРУК і ў прыватнасьці—РАБСЕЛЬКОРЫ.

Рабселькоры—бліжэй усяго зьвязаны з масай. Патрэбы і інтэрэсы рабочых выяўляюцца ў лістох і допісах рабселькораў. Тым больш мае значэньне тая роля, якую закліканы адыграць рабселькоры ў мабілізацыі рабочых мас да падрыхтоўцы Чырвонага Дню, як вялікай, масавай, пралетарскай дэманстрацыі.

Таварышы рабселькоры!

Масавы аддзел рэдакцыі газ. «Зьвязда» заклікае Вас да самага актыўнага ўдзелу ў падрыхтоўцы Чырвонага Дню. Дасылайце свае лісты і допісы ў газ. «Зьвязда». Пішэце ў допісах аб настроях рабочых і сялян у зьвязку з ваеннай падрыхтоўкай буржуазіі, з небясьпекай, пагражаючай СССР. Будзьце ініцыятарамі па выпуску спэцыяльных нумароў насьценгазэт на прадпрыемствах, установах, нардамах, чырвоных кутках і хатах-чытальнях, прысьвечаных Чырвонаму Дню. Вядзеце праз насьценгазэты і сваім асабістым прыкладам агітацыю за пагалоўны ўдзел усіх рабочых і працоўных сялян у дэманстрацыях у Міжнародны Чырвоны Дзень.

Усе рабкоры—на барацьбу з ваеннай небясьпекай, на падрыхтоўку да правядзеньня Міжнароднага Чырвонага Дню!

Масавы аддзел рэд. газ. «Зьвязда».

Па Савецкай Беларусі

Прыяцель кулакоў ў Лошыцкім крэдытным таварыстве

Барысаў. (Наш кар.). На чале Лошыцкага сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства стаяў Курган, які за час сваёй гадовай дзейнасьці скажаў клясавую лінію. У часе веснавой сяўбы 500 пудоў насеннага матар'ялу ён разьмеркаваў самастойна, бяз ведама праўленьня, сярод заможных сялян, у той час, як у беднякоў засталіся незасеянымі палосы. Не забываў Курган таксама і пра сваіх сваякоў, якія атрымлівалі насеньне ў першую чаргу. Тое-ж самае атрымлівалася і пры разьмеркаваньні крэдыту на коняй. Крэдыт атрымлівалі тыя, хто меў сваіх коняй, а беднота, якая ня мела коняй, заставалася бяз крэдыту. Пры разьмеркаваньні насеньня перавагаю павінен быў карыстацца калектыў «Прагрэс», але Курган, які быў супроць ідэі калектывізацыі, катэгарычна адмовіўся ад выдачы калектыву насеньня.

Курган адпусьціў у крэдыт на 2 гады плуг Бэненсону, які мае свой млын і займаецца гародніцтвам, у той час як беднякі, з якімі Курган зусім ня лічыўся, павінны былі купляць сельска-гаспадарчыя прылады за гатовыя грошы.

Кантрактацыя праводзілася выключна сярод заможнага сялянства і часткова сярод кулацтва. Курган лічыў, што кулакі хутчэй здолеюць выканаць свае абавязацельствы.

Значная частка віны падае і на само праўленьне таварыства, якое ня ўжыло адпаведных мер, каб спыніць злоўжываньні старшыні Кургана.

Зараз Курган арыштаваны і па справе вядзецца сьледзтва.

Забясьпечыць выкананьне пяцігодкі

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Рабочыя гомельскай шчацінной фабрыкі пастанавілі пітаць першых пачынальнікаў выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Справа індустрыялізацыі краіны—ёсьць справа рабочае клясы, якая павінна забясьпечыць выкананьне грандыёзнай пяцігодкі.

Падпіска праведзена на 8.000 рублёў. Выкліканы на спаборніцтвы ўсе шчацінныя фабрыкі Беларусі.

Работніца ФРАДЗІНА падпісалася на 400 рублёў, Гарфункель і П. Вапяроні—на 300 руб.

Мопраўскі карнавал у дзень 1 жніўня

Гомель. (Наш кар.). Акругком МОПР'у арганізуе 1-га жніўня карнавал, які будзе адлюстроўваць разгул белага тэрору і ролю духавенства ў барацьбе з рэвалюцыяй. Такі-ж карнавал адбудзецца 21 ліпеня ў часе зьлёту піянэрскай арганізацыі. Гомельскі сольрайком МОПР'у арганізуе 28 ліпеня масавае гуляньне.

Футбольны матч Менск—Гомель

Гомель (наш кар.). Футбольны матч Менск—Гомель скончыўся перамогаю Гомельшчыны. 20 ліпеня для матчу з Гомелем прыяжджае маскоўская каманда.

Дэлегацыя рабочых выехала ў Крым

Мазыр (наш кар.). 16 ліпеня з Мазыра выехала ў Крым дэлегацыя рабочых з 8 чалавек для азнаямленьня з жыцьцём і працай яўрэйскіх калектываў.

Дэлегаты абіраліся на агульных сходах рабочых фабрык «Зьвязда», «Чырвоны Кастрычнік», «Пралетары», на сходзе рабочых транспартнікаў.

Па прыезьдзе з Крыму, дэлегаты будуць рабіць справаздачы на агульных рабочых сходах.

Б. Ш.

Падрыхтоўка да Ўсебеларускай с.-г. выстаўкі

Магілеў (наш кар.). Пры акрвыканкоме адбылася шырокая нарада ўсіх гаспадарчых органаў па пытаньні падрыхтоўкі да Ўсебеларускай с.-г. выстаўкі. Нарада пастанавіла, каб у гэтым годзе былі сабраны экспанаты і захаваны да адкрыцьця выстаўкі. Каштоўныя экспанаты будуць сабраны ў лясьніцтвах і калектыўных гаспадарках.

Каапэрацыйныя курсы для адпускнікоў чырвонаармейцаў

Гомель (наш кар.). ЦРК адкрывае курсы па падрыхтоўцы адпускнікоў Чырвонай арміі для каапэрацыйнай работы. На курсах будуць навучацца 40 чалавек.

Агнятрывалае будаўніцтва на Аршаншчыне

ВОРША. (Наш кар.). Па акрузе арганізуецца 8 новых агнятрывалых таварыстваў. Крэдытамі агнятрывалае будаўніцтва забясьпечана, крэдытаваньне заможнай часткі насельніцтва спынена.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДЛЬСЛУЖАЧЫХ

паведамляе, што ў панядзелак 22 ліпеня г. г. а 7 гад. увечары ў садзе друкароў (Ленінская, 16) склікаецца

НАРАДА СТАРШЫНЬ І САКРАТАРОЎ

МК і ГК, старшынь і сяброў культкамісій пры МК

а насьцярожыцца непарадкам:

1) Аб удзеле п-саюзу ў правядзеньні «Міжнарод. Чырвонага дню».
2) Аб правядзеньні дня індустрыялізацыі.
3) Аб правядзеньні 2-хтыднёвіку фізкультуры.

Яўка ўсіх старшынь і сакратароў МК і ГК, старшынь і сяброў культкамісій абавязкова без спазьненьня.

Барацьба амэрыканскіх ткачоў у Гастоніі

Гастонія—невялічкі фабрычны горад у штаце Паўночная Каралінія ПАЗШ. 15.000 чалавек насельніцтва складаецца выключна з рабочых мясцовых ткацкіх фабрык з сем'ямі. Адносіны, якія пануюць у Гастоніі, характэрны для ўсяго ткацкае прамысловасьці поўдню Злучаных Штатаў. Рабочыя зарабляюць столькі, што жывуць ўпрогаладзь. Баракі для жыцьця знаходзяцца за 5-6 вёрст ад фабрык, пабудаваны з дрэва і ўжо значна падгнілі і працякаюць.

Жыцьцё ў такіх бараках побач з дрэнным харчаваньнем спрыяе масаваму пашырэньню хвароб, асабліва пэлягры, непасрэдна зьвязанай з адсутнасьцю ў ежы некаторых вітамінаў. Пэляграю хварэе вельмі шм

ЭСКАДРЫЛІЯ СУСЬВЕТНАЙ КАМУНЫ*)

Апошні бой

Ужо за чатырыста кілёмэтраў перадавыя самалёты эскадрыліі сусьветнай камуны заўважылі вялізарны бляск пражэктароў над Фохтбургам.

А праз гадзіну пачуліся рэзкія штуршкі ў сьцяны карабля Уралава.

Уралаў падыйшоў да шчотчыка на сьцяне. Трата электрычнай энэргіі спынілася, стрэлка шчотчыка скочыла назад пасьля чацьвертага штуршку.

— А, вось у чым справа? Пачалі працаваць пуасонаўскія хвалі.

Уралаў узяў мікрафон і злучыўся са сваёй радыё-станцыяй.

— На якой хвалі працуе радыё-станцыя генэрала Фохта?—Так. А хвалі Пуасона не перашкаджаюць?—Так. Настройце мой радыёфон, я хачу гаварыць з Фохтбургам.

У гэты момант увайшлі Убанунга-Га, Парахаўніцын, начапэрац эскадрыліі пачштаб Рэнэ Ірондэль і іншыя. Каюта напоўнілася трывожнымі тварамі і галасамі.

— Пуасон не такі ўжо бясшкодны. Мы згубілі чатырох выведчыкаў, якія вагінулі ад сваіх уласных бомбаў, што загарэліся ад пуасонаўскіх іскраў.

Уралаў нахмурыўся.

Ірондэль кінуўся да сябе ў каюту і адтуль трэці раз загадаў праверыць памянёныя Ўралавым апараты на ўсіх самалётах.

Эскадрылія брала вышыню адзінаццаць тысяч мэтраў. Хвалі Пуасона былі значна мацнейшыя, чым такія хвалі, вядомыя ў Эўропе.

Бляск пражэктароў набліжаўся, як полымя планэтарнага пажару.

Было дзевяць гадзін і 40 хвілін вечару, да Фохтбургу заставалася ня болей, як пяцьдзесят кілёмэтраў.

Другі гісторык апіша стратэгічную схэму бою, на падставе вядомых мэмураў Ірондэля, Парахаўніцына і афіцыйных загадаў, зафіксаваных мэханічнымі рэгістратарамі самалётаў эскадрыліі. Нам застасецца аднавіць жывы малюнак гістарычнае бойкі.

О, патрэбен гэній Плутарха і Тацыта, каб жыва перадаць тыя рухі душы, якія тады кіравалі правадырамі і радавымі лётнікамі эскадрыліі. І гэта задача для нас немагчымая. Але хто з нашых чытачоў сам у розуме не адновіць малюнку замяшаньня, што запанавала ў тэй момант, калі раптам трубка асабістага радыёфону фэльдмаршала Фохта загаварыла, пакрываючы гул пасяджэньня Ваеннага Савету ў падземнай залі палацу дыктатара.

— Алё! Мяне слухаюць?—Гаворыць Уралаў.—Алё! Адказвайце.

Сьмяротнай бледнасьцю пакрыліся твары.

— Хто злучыў мяне з Уралавым?—крыкнуў, апамятаўшыся першым Фохт.

Але разважаць было позна, і фэльдмаршал падыйшоў да радыёфону.

— Слухае фэльдмаршал Фохт.

— Слухайце, фэльдмаршал Фохт. Імем Сусьветнай Камуны прапаную вам здацца і спыніць непатрэбнае праліцьцё крыві.

— Не,—адказаў Фохт.

У тую-ж хвіліну, патрасаўшы вямлю, пачуўся гул у залі.

Гэта пачалі працаваць вэнітныя мінамёты Вітэрфорда, кідаючы ў неба паўтаратонныя выбуховыя цыгары.

— Вышыня дванаццаць тысяч мэтраў,—спакойна заявіў радыёфон, намякаючы на сваю недасяжнасьць для бітэрфордавых мін.

— Пуасон,—крыкнуў забыўшыся Фохт.—Чаго вы сядзіце са сваімі машынамі?

А голас навальніцы радыёфону кплівала адказаў.

— Уралаў просіць перадаць пану Пуасону ўдзячнасьць ад паветранага флёту Камуны за добрае забесьпячэньне электрычнасьцю. Мы ўжо вымушаны аддаваць энэргію ў атмасфэру. Чакайце дажджу.

Твар фэльдмаршала Фохта скрывіўся.

— Скажэце,—ціха зьвярнуўся Фохт да прысутных,—ці магчыма перапаўненьне іх акумулятараў, або чорт ведае яшчэ чаго, каб урэшце хвалі пачалі ўплываць?

— Як відаць, не.—адказаў прысутны ў залі прафэсар Канэ. У іх, як відаць, ёсьць нейкія трансфарматоры электраэнэргіі, нам невядомыя, а ёмістасьць атмасфэры бязьмежна,—з бесьсьвядомай гіроніяй закончыў журботны адказ вучоны.

У пакой увайшоў морскі міністар Футо-Яма.

— Што рабіць, ваша высокасьць,—закрычаў ён,—нашы міны разрываюцца, морскі кардон прарваны, берег адкрыты. Пуасон занадта ўзмацняе работу і азаляваньня мін не вытрымлівае.

— Спынеце гэтага дурня Пуасона,—хрыпла сказаў фэльдмаршал.—Яго ідыёцкія хвалі працуюць толькі на шкоду нам, а не працўніка.

Але хвалі Пуасона былі тут ня прычым.

Гэта стары Парахаўніцын перасеў на выведчы апарат і в групаю такіх-жа адважных камандзіраў, зьнівіўшыся пад пагражаючым атнём эфітных мінамётаў Бітэрфорда, у віхуры паветраных плыняй, пры напружанай работе стабілізатараў, якія ледзь стрымлівалі машыны, лётаў над бушуючым морам.

Пражэктары кідалі ўніз з самалётаў снапы сьвятла. Гэта дало поўную магчымасьць прыцэліцца для варожых гармат, але затое давала магчымасьць в поўнай яснасьцю назіраць морскае дно зьверху.

Нарэшце лінія мін была адкрыта, і сотні тон наймацнейшых дэтанатараў паляцелі ў глыбыню мора. Ні Парахаўніцын, ні іншыя лётнікі на другіх апаратах ня чулі грому гэтага выбуху шалёнай кананады з востраву,—яны, убачыўшы толькі яшчэ больш закіпелую ваду, узялі ранейшую бясьпечную вышыню.

Вораг быў дэзарганізаваны.

Аддаўшы свае недарэчнае распараджэньне спыніць работу Пуасона, якая была небясьпечнай для эскадрыліі, фэльдмаршал Фохт асудзіў сябе на поўную пагібель.

Радыёфон у падземнай залі без перапынку паведамляў Ваеннаму Савету Мадагаскару аб пагражаючых дзеяньнях чырвонага ворага.

— Здаяцёся?—гаварыў радыёфон.

— Не,—усё яшчэ адказаў Фохт.

—Дык слухайце спыненьне кананады на ўсходнім узьбярэжжы. Я пасылаю туды 200 тон інтрытолу. Шануйце людзей!

Калі пачало сьвітаць, ад гэтых пасылак ужо маўчалі $^{2}/_{3}$ гармат Мадагаскару. Батарэі былі падобны да разбураных матар'яльных магілак. Рэзкія мэталёіды выводзілі назаўсёды гарматы са строю.

— Здаяцёся?—пытаўся радыёфон.

— Не!—крычаў дыктатар.

— Я працую бяз страт,—чуўся голас Уралава.—Я яшчэ шаную горад і мірнае насельніцтва, мадагасаў і неграў. Але ўсякаму цярпеньню бывае канец. Слухайце.

Змоўкла страляніна бліжэйшых батарэй. Прапавалі толькі ўмацаваньні Фохтбургу. Уралаў сапраўды шкадаваў гораду.

Раптам радыёфон засьпяваў магутнымі гукамі «Інтэрнацыянал». Гэта было адлюстраваньне правадоў в Лёндану.

Схапіўшыся за галаву, фэльдмаршал Фохт, думаючы, што руйнуючы дзеяньне інтрытолавых снарадаў, зараз пачне дзейнічаць над яго палацам і сталіцай, падбег да Рокфэлера.

— Здавайцеся!—сказаў ён яму на вуха,—перамагаючы магутны аркестр.—Мы былі гэроямі, а я...

І ён вышаў.

Праз пяць хвілін у адноўленай цішыні Рокфэлер моцна гаварыў у чорную пастку радыёфону:

— Пашкадуйце горад. Урад Мадагаскару паведамляе, што фэльдмаршал Фохт застрэліўся. Мы здаемся.

— Хто гаворыць? Пан Мусаліні?

— Пан Мусаліні схаваўся і паводле атрыманых вестак забіты тубыльцамі. Гаворыць міністар узбраеньняў Рокфэлер.

Акумулятары эскадрыліі па загадзе Ўралава аддалі ўсю энэргію ў паветра. Маланка прарэзала атмасфэру. Згушчаліся хмары. Выратаваўчы дождж як з вядра пачаў ліць над горадам, над астравамі, акісьляючы атруту.

Радыёграмы эскадрыліі выклікалі савецкія судны в Порт-Нату, паведамляючы, што мінны кардон Фута-Яма зьнішчаны, а падводныя лодкі выходзілі на паверхню мора, згодна загаду Ўралава і строіліся пад чырвоным штандарам.

*) Канец, пачатак глядзі ў нумарох 159, 160, 161.

АПАВЯДАНЬНЕ С. БУДАНЦОВА

СКОНЧЫЛІСЯ ПЕРАВЫБАРЫ ЗАСЯДАЦЕЛЯЎ БЮРО СКАРГАЎ

Кампанія перавыбараў засядацеляў бюро скаргаў РСІ па Менску скончана. Ня гледзячы на тое, што перавыбарчая кампанія супала з больш важнай працай—праверкай кіруючага складу КП(б)Б, яна прайшла пры надзвычайнай актыўнасьці рабочых мас і зацікаўленасьці іх работай бюро скаргаў.

У спрэчках па справаздачы выступаўшыя таварышы шмат спыняліся на адмоўных бакох працы, што, бязумоўна, правільна. Завастралася ўвага па замкнутасьці працы бюро скаргаў: пасяджэньні праводзіліся ў памяшканьні НК РСІ, а ня ў клюбах прадпрыемстваў і прафсаюзаў, бюро скаргаў не рабіла справаздач на прадпрыемствах на працягу году; слаба асьвятлялася работа бюро у друку; засядацелі не скарыстоўваліся як належыць; засядацелі ніколі не рабілі справаздач перад выбаршчыкамі; зацягваўся разгляд спраў у бюро скаргаў; слаба наладжаны быў вучот і праверка працы добраахвотнікаў «лёгкіх-кавалерыстых».

Гэтыя дэфэкты, бязумоўна, у той або іншай ступені мелі месца, і пры далейшай працы будуць ліквідаваны.

Для гэтага трэба ўцягнуць у працу бюро больш рабочых ад варштату ў якасьці добраахвотнікаў і скарыстаць засядацеляў на рабоце па абсьледваньні. Таксама трэба больш поўна скарыстаць «легкіх кавалерыстых», бо ў апошні год з 432 «кавалерыстых» працавала 136 ч.—31 проц., а з 94 добраахвотнікаў толькі 22 ч. — 23 проц., апроч гэтага бюро скаргаў ня было зьвязана з сэкцыяй РСІ гарсавету і делегаткамі. Гэтыя недахваты прыдзецца ў далейшым зьнішчыць.

Новы склад засядацеляў бюро скаргаў павінен быць зьвяном, якое зьвязвае РСІ з рабочымі масамі. Пры актыўным удзеле саміх рабочых задачы, пастаўленыя перад бюро скаргаў, будуць выкананы поўнасьцю.

Кудзелька.

2-гі зьезд с.-г. крэдытсаюзу Менскай акругі

Пазаўчора ўвечары, у Цэнтральным Доме Селяніна адкрыўся другі акруговы зьезд упаўнаважаных Менсельгаскрэдытсаюзу.

Зьезд адкрыў ад імя савету крэдытсаюзу т. Хлебнікаў, які ва ўступным слове адзначыў ролю і задачы сельгаскрэдытсаюзу ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Зьезд зацьвердзіў наступны парадак дня: даклады Белсельсаюзу, Менсельдзяржкрэдытсаюзу, калгассаюзу, даклад аб мэтадах прыцягненьня селянскіх сродкаў.

На першым-жа пасяджэньні з дакладам Белсельсаюзу выступіў старшыня апошняга т. Дубіна.

Учора на ранішнім пасяджэньні разгарнуліся спрэчкі па дакладу Белсельсаюзу.

***

Учора селяне Лагойскага раёну прывезьлі падарунак зьезду — звыш 300 пудоў хлеба, які яны здалі на склад Менсельгаскрэдытсаюзу.

***

Селянін-делегат Бягомльскага раёну т. Катэка выступіў на зьезьдзе з пацзякай ураду ад селян Бягомльшчыны за дапамогу ў правядзеньні веснавой пасеўкампаніі.

— Ніколі яшчэ, — сказаў селянін, мы не атрымалі такой матар'яльнай дапамогі з боку ўраду і каапэрацыі, як у гэтым годзе.

Адкамісіі па чыстцы АКРЗ'а

У панядзелак, 22 ліпеня, роўна а сёмай гадзіне ўвечары ў залі спэцыялістых у Доме Селяніна пачнецца чыстка апарату АКРЗ'а. Яўка ўсіх супрацаўнікоў АКРЗ'а абавязкова. Запрашаюцца прыняць удзел рабочыя прадпрыемстваў, дэпутаты гарсавету, працаўнікі АВК, яго аддзелаў і іншых акруговых устаноў, селяне, а таксама ўсе члены брыгады і камісій, правяраўшыя асабовы склад і працу АКРЗ'а.

У БДУ ПАДАНА ТОЛЬКІ 110 ЗАЯЎ

Цяганіна з атрыманьнем даведак тармазіць камплектаваньне ВНУ

Пачаўся прыём заяў у ВНУ і тэхнікумы. Заўсёды ў гэты час на кожнае вакантнае месца падавалася па 4-6 заяў. У гэтым годзе па сёньнешні дзень падана ўсяго: на праўгас—13 заяў, на пэдфак—53 і на мэдфак—45, а ў Горацкую с.-г. акадэмію—100, у палітэхнікум—200.

Такі слабы тэмп паступленьня заяў можна тлумачыць радам прычын. Асабліва затрымлівае падачу заяў цяганіна з выдачай даведак аб выбарчых правох. Асоба, якая падае заяву, зьвяртаецца ў гарсавет, гарсавет адсылае ў міліцыю, міліцыя прымае заяву і назначае спэцыяльнае абсьледваньне. Усё гэта стварае цяганіну, затрымлівае падачу заяў. Трэба спрасьціць выдачу справак.

Зусім дрэнна папулярызававы правілы прыёму. Справачнік Наркамасьветы аб правілах прыёму выйшаў з спазьненьнем на цэлых 2 месяцы. Інфармацыя аб прыёме пастаўлена таксама вельмі слаба.

Слабая падача заяў тлумачыцца яшчэ і тым, што чужы элемант, які заўсёды засыпаў прыймовыя камісіі тысячамі заяў, зараз ужо не адважваецца паступаць у ВНУ, бо ведае, што ёсьць моцны фільтр, праз які яму не пралезьці.

Рабфакаўцы, якія паступаюць у ВНУ, а таксама рабочыя не сьпяшаць з падачай заяў, будучы ўпэўненымі, што іх месца забясьпечаны за імі.

Усе гэтыя прычыны тармазяць падачу заяў і ствараюць *небясьпеку неўкамплектаваньня ВНУ і тэхнікумаў пралетарскім элемэнтам.*

Трэба зараз-жа *шырока папулярызаваць правілы прыёму ў ВНУ праз* прафсаюзы і грамадзкія арганізацыі. Сялянства, якое амаль вусім не інфармавана аб правілах прыёму, павінна зараз-жа атрымаць праз акруговыя газэты поўную інфармацыю аб правілах прыёму.

Трэба разгарнуць сетку курсаў па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ і тэхнікумы.

Савецкая грамадзкасьць павінна сур'ёзна заняцца справай укамплектаваньня ВНУ і тэхнікумаў.

— 19 ліпеня, у пятніцу, а 6 з палов. гадз. увечары, у клюбе Карла Маркса адбудзецца сход партактыву г. Менску, на якім зробіць даклад аб чарговых задачах парт. арганізацыі т. СЛАВІНСКІ.
Білеты на ўваход па райкомах КП(б)Б.
Члены ЦК, АК, Прэзыдыуму ЦКК і АКК уваходзяць па сваіх мандатах.

ДА ВЕДАМА ГАЗЭТНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА ГАЗЭТНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ па пытаньнях распаўсюджаньня, экспедаваньня і дастаўкі перыядычнага друку, якая не адбылася 10 ліпеня, пераносіцца на панядзелак 22-га ліпеня.

ПАРАДАК ДНЯ: Даклад нам. заг. газэтным бюро тав. БАШЫНКЕВІЧА аб азнаямленьні яго з пастаноўкай газэтнай справы ў Ленінградзе і аб прыстасаваньні вопыту Ленінграду ў Беларусі.

Нарада адбудзецца ў клубе Нарсувязі (будынак пошты—у двары), а 7-й г. ув. Запрашаюцца ўсе працаўнікі мясцовых газэт і часопісаў, аддзяленьняў цэнтральных выдавецтваў, зборшчыкі падпіскі на прадпрыемствах, ва ўстановах і райсковых часьцях, лістаносы, газэтаносы і ўсе жадаючыя.

Газэтнае бюро

За дзень

Сынагога пад клюб. ЦП саюзу швэйнікаў адпусьціў 20.000 рублёў на пераабсталяваньне харальнай сынагогі ў Віцебску пад клюб для рабочых швэйнікаў. Клюб будзе зьмяшчаць 1.200 чалавек.

Антыэміта вон з саюзу. ЦП саюзу хэмікаў зацьвердзіў пастанову сходу рабочых гуты «Праца» аб выключэньні антысэмітаў з саюзу.

Бесьперапынная праца кіно. Белдзяржкіно пастанавіла перавесьці ўсе кіно Менску на бесьперапынную працу на працягу ўсяго тыдню.

Невыкананьне дырэктыў па ахове працы. Прыцягнута да судовай адказнасьці адміністрацыя абуткавай фабрыкі ў Віцебску.

Курсы вылучэнцаў. ЦП саюзу транспартных рабочых пастанавіла арганізаваць у Менску вячэрнія курсы для падрыхтоўкі рабочых-вылучэнцаў на адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады.

Здарэньні

Растрата. Крымінальным вышукам прыцягваюцца да адказнасьці за растрату буфэтчыцы 8-й сталовой ЦРК—Цырліна, Цукерман і Бровіна.

Рэцэпты морфіністым. За незаконную выдачу рэцэптаў на морфій прыцягваецца да адказнасьці лекпом цэтральнай амбуляторыі Лукомскі.

Дзяржцырк

Праграма Менскага дзяржцырку зноў абноўлена багатымі нумарамі. Сярод новых нумароў праграмы асаблівую ўвагу зьвартае на сябе работа артыстых маскоўскага дзяржцырку братоў МІРАСЛАЎСКІХ, або як іх завуць «сталёвыя капітаны». Нумары «сталёвых капітанаў» складзены выключна на правільным вылічэньні, захаваньні роўнавагі, г. зн. на балансаваньні.

Самым лепшым нумарам братоў МІРАСЛАЎСКІХ зьяўляецца нумар в шастом, дзе пунктам апоры зьяўляецца лоб, а на версе шаста пад купалам робіць розныя камбінацыйныя акты другі артыст.

Зьяўленьне пасьля гэтага нумару на манежы нічэмнага камэдыянта, рыжага Сэржа, выклікае ў глядача толькі агідноасьць да клёўнады.

Выступленьне Ралана і Мішэля ў камічным антрэ характарызуецца адсутнасьцю, на кажучы ўжо аб палітычнай, нават бытавой сатыры, якая павінна складаць адну з важных частак цырковай праграмы.

Трэба адзначыць цікавае выкананьне рызыкоўных нумароў на трапецыі эксцэнтрыкі ГЕРЦАГ.

Г—ч.

10 тысяч працдагавароў на батракоў

Гэтымі днямі адбылася акруговая нарада інструктароў ЦП саюзу с.-г. рабочых, якая падвяла вынікі працдагаворнай кампаніі па Менскай акрузе.

З 12.000 працдагавароў на батракоў, якія паводле пляну павінны былі быць заключаны, на 1 ліпеня падпісана 10.200 дагавароў. Скасавана і пераключана звыш 1.000 дагавароў, якія не адпавядалі запатрабаваньням саюзу.

Нарада намецілa ў далейшым праверыць, як выконваюцца працдагавары з боку наймальнікаў, як ахоплена батрацтва сацыяльным страхаваньнем. Пастаноўлена разгарнуць на саўгасах сацыялістычнае спаборніцтва.

Паведамленьні

— Кастрычнікам райком МОПР'у паведамляе, што ў пятніцу, 19 ліпеня, а 7 гадз. увечары адбудзецца нарада жансэкцыі. Членам гэтае сэкцыі зьявіцца абавязкова.

— Усе таварышы, камандыраваныя Менакругкомам у лік «1000» ва ВТУЗ'ы, павінны па іх асабістых справах зьявіцца ў Менакругком.

— У пятніцу, 19 ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары, адбудуцца заняткі агітсэкцыі Кастрычнікавага РК МОПР'у. Для членаў сэкцыі і таварышоў, вылучаных ячэйкамі, яўка абавязкова.

Кастр. РК МОПР'у.

— АРУ. У пятніцу, 19 ліпеня, а 6 гадз. увеч. у канцылярыі АРУ (клюб саўгандальслужачых) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму.

Парадак дня:

1) зацьвярджэньне пляну працы аб'яднаньня: а) па арганпрацы, б) па аддз. кансульт. і экспэртызы, в) па каштар.-бюдж. сэкцыі. 2) Аб удзеле АРУ ў сац. спаборн. 3) Бягучыя справы. Запрашаецца актыў АРУ.

— Сад працаасьветы. Сёньня—кіно фільм «Каламута». Пачатак а 10 гадз. увеч.

— У суботу, 20 ліпеня, а 5 гадз. веч. у памяш. АК МОПР'у адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Мен. АК МОПР'у.

Парадак дня:

1. Вынікі Фрунзаўскага РК па кампаніі дапамогі берлінскім рабочым.
2. Аб карнавале.
3. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх членаў і канд. прэзыдыума АК МОПР'у—абавязкова. На пасяджэньне павінны зьявіцца ўсе члены карнавальнай камісіі.

АК МОПР'а.

— У суботу, 20 ліпеня, а 6 ай гадз. увечары адбудзецца пленум Кастрычнікавага райкому МОПР'у з наступным парадкам дня:

1) вынікі правядзеньня першамайскай кампаніі,
2) аб падрыхтоўцы да 1-га жніўня.
3) інфармацыя аргсэкцыі аб становішчы яе працы.

Яўка ўсіх членаў райкому абавязкова.

— Дакладчыкамі для правядзеньня на прадпрыемствах мітынгаў аб значэньні Міжнароднага Чырвонага Дню Фрунзаўскі райком КП(б)Б вызначае наступных таварышоў: Шукевіча-Трацьцякоўва, Фрыдмана, Каплана, Табачнікаў, Вербу, Кінэра, Лодысёва, Брушкова, Аўчыньнікава, Кучынскага, Асьмова, Мельнікава, Ігнатоўскага, Ошарава, Аршанскага, Слоніма, Цыдаровіча, Ярмакова, Смаля, Баля, Каркліна, Мазура, Літвіновіча, Сізаева, Валасевіча, Чарнушэвіча, Абрамсона, Масюкова, Рачыцкага, Хацкевіча, Марчсіна, Анодзіна, Радкевіча, Бяляна, Розэнбэрга, Макаравіча, Ярмаловіча, Гінзбурга і Купцэвіча.

Дакладчыкам трэба азнаёміцца з плянам Міжнароднага Чырвонага Дню, разасланым у ячэйкі, і даклады падрыхтаваць да 26-27-VII-29 г. Матар'ял для дакладаў 22-VII-29 г. атрымаць у АПО РК КП(б)Б.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б.

— У пятніцу, 19 ліпеня, а 8 гадзіне ўвечары, у саўдзе друкароў (Ленінская, 20) адбудзецца АГУЛЬНЫ СХОД БЕСПРАЦОЎНЫХ гораду Менску.

У парадку дня:

1. Даклад аб здарэньнях у Кітаі,
2. Кіно.

Білеты—у культкамісіі Біржы працы.

— У суботу, 20 ліпеня, а 8 гадз. ув., у памяшканьні клюбу імя Р. Люксэмбург, адбудзецца масавы мітынг працоўных палякаў. Даклад зробіць старшыня делегацыі працоўных палякаў БССР на варшаўскі зьезд т. Кукелка.

— У нядзелю, 21 ліпеня, а 8 г. ув. у памяшканьні рабочага тэатру ў Н.-Барысаве, адбудзецца масавы мітынг працоўных палякаў. Даклад зробіць старшыня делегацыі працоўных палякаў БССР на варшаўскі зьезд т. Кукелка.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

КІНО-ТЭАТР „Культура“
Новы мастацкі балявік
МАТРОС ГАЛАЙ
у 6 частках.
Пачатак сэансу роўна а 8 гадзіне
Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА
Сасецкая, 71.
2 мастацкіх фільмы ў адзін сэанс 2
1. Тры пакоі з кухняю
2. ПА КОНГО
Пачатак сэансаў а 9 г. 15 м. Каса—ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Новы фільм, вытворчасьці ВУФКУ
Млын паўскрай лесу
драма ў 6 част.
Звыш праграмы: Кіно-хроніка Савкіно № 28
Пачатак ад 7 з пал. г. Каса—ад 5 з пал. г.

КІНО Пралетары
2 балявікі у адзін сэанс 2
1. Ігар Ільінскі у фільме
ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ
2. Гарольд Лёйд у фільме
МАРАК
Пачатак—а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 гадз.

КІНО Спартак
Грандыёзны замежны фільм
„БЛАНШЭТ“
драма ў 7 частках.
Каса адкрыта ад 6 гадз.
Пачатак а 7½ гадзіне ў вечары.

У нядзелю, 21 ліпеня а 12 гадз. дня ў саўгасе „ГОРКІ-АПЧАК“, Смілавіцкага раёну Менскай акругі
АДБУДУЦЦА ЗАКРЫТЫЯ ТАРГІ
на здачу ў арэнду на 1929 год
ФРУКТОВАГА САДУ.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінск., побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутран., хірургічн., жаночыя, зубныя хваробы вока, нэрваў, хваробы вуха, горла і носа і хваробы скуры
ФІЗІЯТРЫЧНЫ ГАБІНЭТ кварц, электра і сьвета лячэньне
РЭНТГЕНАЎСКІ ГАБІНЭТ робіць здымкі, прасьвечваньне і лячэньне хворых. Прыём хэміка бактэрыялёгічных аналізаў.
КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ
Прымаюць па папярэднім запісе
На нервовых — праф. Кроль на чацьвяргох ад 6 гадз.
На кішэчна-страўн. — дацэнт Монасзон па аўторках ад 8 гадз.
На хваробах скуры — х-р Розэнталь па суботах ад 12 да 1 з пал. гадз. і па серадах ад 8 г. увеч
На дзіцячых хвар. — х-р Гурэвіч па суботах ад 10 да 12 гадз.
Прыём хворых па ленавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадян за агульнадаступную плату —

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ І КАМОПЭРЫ
ПЯТНІЦА, 19 ЛІПЕНЯ — ПАПУЛЯРНАЯ МУЗКАМЭДЫЯ
ЖРЫЦА ОГНЯ у 3-х дз.
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 г. і ад 5 г. дня і ў раб. касе ад 12—2-х ч. і ад 4—6 ч. увечары
Падрабязнасьці ў афішах — Дырэкцыя

СЁНЬНЯ 19 ліпеня
ДЗЯРЖЦЫРК — АПОШНІЯ 3 ДНІ
Гастролі Маскоўск. Дзяржаўн. цырку
АПОШНІЯ ГАСТРОЛІ Уладзімера ДУРАВА (малодшага)
1-шы раз у БССР
СЛАВУТАЯ ДУРАЎСКАЯ ЧЫГУНКА
ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ УСЯ ТРУПА.
З прычыны абшырнай праграмы, пачатак роўна а 9 гадз. увеч.

Вышаў з друку і паступіў у продаж, а таксама рассылаецца падпісчыкам № 6 (чэрвеньскі нумар) беларускай часопісі літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі і крытыкі
„ПОЛЫМЯ“
ЗЬМЕСТ:
ПРОЗА: Цішка Гартны—Крыжавыя дарогі. Васіль Сташэўскі—Архангелы в крэсаў. Язэп Конта—Марта, Марыля, Галена.
ПОЭЗІЯ: Якуб Колас—На шляхох волі. А. Александровіч—Нараджэньне чалавека.
АРТЫКУЛЫ: М. Равіч-Чэркаскі—Нацыянальнае і колініяльнае пытаньне ў ленінізьме. Я. Кіпель—Праблема эўгенікі. Л. Акіншэвіч—Беларускае казацтва ў украінскай гісторыяграфіі. Д. Васілеўскі—А. Вярыга і яго літаратурна-грамадзкая чынасьць. Я. Лёсік—Граматычны склад мовы Цішкі Гартнага. З. Сьнежка і Л. Рызор—Хрысто Сьмірненскі. М. Равіч-Чэркаскі—«Молодая Белоруссия» Л. Клейнборта.
КНІГАПІС
ХРОНІКА
ПРЫЁМ ПАДПІСКІ ВЯДЗЕЦЦА: у Бюро падпіскі і кніга-поштай БДзВ (Менск, Пляц Волі, № 5), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДзВ, у аддзеле падпіскі Беларускага Аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая, 54) і яго агентурай па акругах і раёнах, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і агенцтвах, у Беларускім аддзяленьні выдавецтва „Известия ЦИК“ і „Правда“ (Менск, Савецкая, 61)
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На год . . . 12 р. — к. | На 3 месяцы . 3 р. 25 к.
„ 6 месяцаў . 6 р. 50 к. | Цана асобн. нумару 1 р. 25 к.
Бюро падпіскі «Кніга-Поштай» БДВ.

АДКРЫТ ПРЫЕМ ПАДПІСКІ на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы
НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі
Бальшавік Беларусі — 1 м.—20 к. (замест 35 к.)
Рабоче-Крестьянский Корреспондент — 1 м.—25 к. (замест 30 к.)
ОГОНЕК — 1 м.—25 к. (замест 40 к.)
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, яе упоўнаважанымі, аддз. «Известия» и «Правда», Беларускім газэтным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда“, аддз. „Известия“ і „Правда“, кіёскамі к-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
З мэтай эканоміі газэтнай паперы, камплекты газэты „Зьвязда“ будуць друкавацца за першыя чысла кожнага месяцу ў самай абмежаванай колькасьці.
Таму гал. кантора газ. „Зьвязда“ просіць усіх падпісчыкаў здаваць падпіску да 28-га чысла.
Па заказах, якія паступяць у гал. кантору несвоечасова, к-ра не гарантуе высылкі газэты камплектам за першыя чысла, а толькі са дня паступленьня заказу.
Каб забясьпечыць атрыманьне першых нумароў «Зьвязды» за жнівень, просьба падпісацца загадзя, не пазьней 27—29 ліпеня.

ДА ЗАЎТРА??

ЮЖХИМТРЕСТ
ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ
ГЕНЕРАЛЬНЫЙ ПРЕДСТАВИТЕЛЬ ХИМСИНДИКАТ

ПРАДАЮЦЦА
БОЧКІ з жалезнымі абручамі ад друкарскай фарбы.
БАЛЁНЫ у плеценых кашох з-пад салянай кіслаты.
Зварочваецца да заг. гаспад. друк. «Зьвязды» (Савецкая, 63) ад 3—5 гадз. дня.

ЗДАЮЦЦА ДВА ПАКОІ
малыя або адзін вялікі
Правіянцкая вул. № 52-б, кв. 1

МУЖ-ЖЕНЕ!
должен приобрести, если хочет с'экономить ДЕНЬГИ и иметь вкусно приготовленную пищу. Кст. повареи. книгу Анны. Раст., молочн. стол. Меню 500 разн. питат. вегетар. и диетич. блюд (завтраки, обеды, ужины, дессерты, печенье и пр.). Цена 1 р. 50 к., в перепл. 1 р. 75 к. Высыл. налож. плат. Москва, Политехнический музей, 110|26 „КУЛЬТУРА и ЗНАНИЕ“.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяртацца па тэл. 7-81

У пятніцу, 19 ліпеня а 7 гадз. у памяшканьні ЦСПСБ (заля МБІТ, пакой № 4)
СКЛІКАЕЦЦА
НАРАДА рабочых, удзельнікаў абодвых груп экскурсіі па яўрэйскіх калгасах БССР
сумесна з заг. культаддзелам ЦП саюзаў і старшынь ФЗМК, якія дэлегавалі экскурсантаў, Белзаетам і Менаетам.
На нараду запрашаюцца таксама прадстаўнікі астатніх прафсаюзаў, фабзаўмясцкомаў г. Менску і прадстаўнікі друку.
Культаддзел ЦСПСБ.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА“ Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі
Мэтрычная справака Бэрмана Л. С., выд. у 1912 г. б. Ігуменскім казённым рабінам 2070
Біржавы талён за ліпень месяц. Міхалкевіч Э. І., выд Менскай біржы працы. 2071
Мэтрычная справака Бэрмана Л. С., выд. у 1912 г. б. Ігуменскім казённым рабінам. 2070
Біржавы талён за ліпень месяц, выд. Менскай біржай працы Міхалкевіч Э. І. 2071
Каапэрац. кн. Мацюша М. П., выд. Менскім прыгарочным спажывецкім т-вам «Земляроб». 2072
Вучотна-тэхнічны білет Бахцеева Ф. Я, выд. Менск. акр. аддзелам працы за № 290. 2073
Член. біл. саюзу камунальнікаў Ляшкевіч О. Я. 2074
Інвал. кн. Чупрына М. П., выд. Слуцк. райсабезам. 2075
Ч. кн. саюзу мэдсанпрацы Злотнікавай Э. А. 2076
Пашпарт Одэс Р. М., выд. Менскай міліц. 2077

Друкарня імя «Зьвязда». Менск — Менск Галоўлітбел № 1[illegible]

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2